КУЛЬТУРА СУПРАЦЬ ЗЛА 7

ЗАГАДКА ЗДЫМКА З ІЛЬЁЙ РЭПІНЫМ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 САКАВІКА 2022 г. СЕРАДА № 51 (29673)

КАРАТКА

• «Белпошта» правядзе акцыю да 30-годдзя першай паштовай маркі. У гэты дзень у месцах правядзення акцыі кліенты змогуць набыць паштовыя карткі, падпісаць іх і бясплатна адправіць сваім блізкім і сябрам па тэрыторыі Беларусі.

• У Гродне адкрылі новы дзіцячы садок.

• ДАІ Мінска ўзмоцніць кантроль за бяспекай пешаходаў 16—18 сакавіка.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«У Беларусі вялікі патэнцыял у сферы імпартазамяшчэння, ёсць шырокія магчымасці для супрацоўніцтва з расійскімі партнёрамі. Пытанні імпартазамяшчэння для нашых прадпрыемстваў ва ўмовах, калі нам закрылі рынкі, з'яўляюцца вельмі важнымі. Прывяду адзін прыклад. Доля нашага экспарту ў Расію па машынах і абсталяванні ў іх імпарце складае сёння ўсяго толькі 3-4 працэнты, у той час як 10 гадоў таму гэта было каля 11 працэнтаў. Так што патэнцыял у нас істотны. Такое акно магчымасцяў нам вельмі хутка трэба выкарыстоўваць — гэта дасць і магчымасць замясціць аб'ёмы экспарту, што выпадаюць, і новыя магчымасці для навукі. Нашы калегі дастаткова актыўна нам дапамагаюць. Думаю, што тыя пазіцыі, якія ў нас выпадаюць у машынабудаванні, мы вельмі хутка зможам замясціць і дапамагчы нашым расійскім партнёрам».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НАМ НЕАБХОДНА ВЫБУДАВАЦЬ ПАЛІТЫКУ ТАК, КАБ УТРЫМАЦЬ СВАЮ КРАІНУ, ЯК БЫ НІ БЫЛО ЦЯЖКА»

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з кіраўнікамі і аператыўным складам органаў дзяржаўнай бяспекі

У Палацы Незалежнасці прайшла, бадай, самая закрытая нарада з удзелам Аляксандра Лукашэнкі. Твары большасці прысутных на ёй не павінны трапіць у відэакамеры і фотааб'ектывы, іх імёны не прагучаць у выпусках навін і артыкулах газет: на сустрэчу запрасілі супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі. Яны, як ніхто іншы, ведаюць глыбіню і адваротны бок усіх сродкаў і метадаў уздзеяння, накіраваных на Беларусь, падкрэсліў кіраўнік краіны.

Фота БелТА.

Канчатковая кропка гібрыднай вайны

Па словах Прэзідэнта, сярод сродкаў гібрыднай вайны, якія прымяняліся ў дачыненні да Беларусі, — інспіраванне дзяржаўнага перавароту, арганізацыя тэрактаў, акцый па запалохванні насельніцтва, правядзенне агрэсіўнай інфармацыйнай вайны, спробы разбурыць эканоміку.

«Словам, гібрыдная вайна. Менавіта такія войны ў сучасную эпоху будуць ва ўсіх пунктах нашай планеты, калі будуць. І канчатковы пункт гэтай гібрыднай вайны, вядома, ваенная агрэсія. Пакуль мы да гэтага не дайшлі», — сказаў кіраўнік краіны.

На яго думку, красамоўна гавораць пра вастрыню сітуацыі вакол Беларусі раскрытыя сіламі КДБ планы па ўчыненні гвалтоўных экстрэмісцкіх дзеянняў у адносінах да прадстаўнікоў дзяржаўных СМІ, суддзяў, дэпутацкага корпуса, супрацоўнікаў сілавых структур і членаў іх сем'яў.

Па звестках Прэзідэнта, летась органамі дзяржбяспекі ва ўзаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі структурамі папярэджана 11 спроб учынення тэрарыстычных актаў, арганізаваных і прафінансаваных з тэрыторыі Польшчы, Літвы, Украіны, ЗША і Германіі.

«Гэта тое, што мы ведаем, і тое, што можам сказаць...» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Магутней, чым біялагічная зброя

Дзякуючы намаганням у тым ліку супрацоўнікаў, якія прысутнічалі на сустрэчы, задакументавана і спынена дзейнасць сеткі так званых «спячых» ячэек праекта «Рабочы рух», які курыруецца спецслужбамі ЗША і Літвы, акцэнтаваў Прэзідэнт.

«Удзельнікамі гэтага экстрэмісцкага фарміравання планаваліся дыверсіі з гібеллю людзей на аб'ектах Аршанскага і Мінскага чыгуначных вузлоў, на прадпрыемствах «Гродна Азот», «Гомсельмаш», «Нафтан», БМЗ. Для карэкціроўкі заходняй санкцыйнай палітыкі праз сетку інфарматараў ажыццяўляўся і да гэтага часу ажыццяўляецца збор закрытых даных аб механізмах процідзеяння эканамічным абмежаванням», — пералічыў факты кіраўнік краіны.

СТАР. 2

Максімальная самаадданча, мабілізацыя ведаў і прафесіяналізму

З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай на адкрыцці восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Сёння для нас знамянальны дзень — мы адкрываем не толькі восьмую сесію Савета Рэспублікі, але і, па сутнасці, пачынаем новы этап развіцця беларускага дзяржаўнага будаўніцтва і айчыннага парламентарызму.

Безумоўна, у 2022 годзе Дзень Канстытуцыі набывае асаблівы сэнс, статус і значэнне. Гэтая дата ў календары стала бліжэй кожнаму беларусу. Кожны з нас датычны да абнаўлення Асноўнага Закона краіны. Мы ўсе разам зрабілі вельмі вялікую, вельмі важную справу — упісалі новую старонку ў гісторыю суверэннай Беларусі.

У гэтай няпростай геапалітычнай абстаноўцы мы змаглі ажыццявіць такі важны для нашай краіны крок, як абнаўленне Асноўнага Закона. Магчыма, мы перажываем адзін з самых складаных крызісаў чалавечай цывілізацыі. Ва ўмовах высокай няпэўнасці ніхто не гатовы даць адназначны прагноз, што нас чакае далей. Але відавочна — свет ужо не будзе ранейшым.

СТАР. 4

Час новых рашэнняў

З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на адкрыцці восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Паважаныя дэпутаты і запрошаныя!

Адкрываецца восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Сімвалічна, што гэта адбываецца ў момант, калі краіна адзначае найважнейшае дзяржаўнае свята — Дзень Канстытуцыі. Сёння для кожнага беларуса ён набывае асаблівае значэнне. Дзяржавай і грамадствам праведзена беспрэцэдэнтная работа. Абноўленая Канстытуцыя ў літаральным сэнсе ствараласа народам і для народа.

Зрабіўшы свой выбар, людзі прагаласавалі за суверэнітэт, грамадзянскі мір, сацыяльную справядлівасць і эвалюцыйны шлях развіцця. І цяпер нам усім разам трэба будзе выканаць адказную стваральную місію па ўвасабленні нормаў Асноўнага Закона ў жыццё.

Адну з ключавых роляў у фарміраванні новага аблічча Беларусі закліканы сыграць парламент. Карыстаючыся магчымасцю, хачу шчыра падзякаваць дэпутацкаму корпусу, які ўзяў актыўны ўдзел у арганізацыі грамадскага дыялогу, падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі і правядзенні рэферэндуму.

Перакананы, што кожны дэпутат усведамляе ўсю ступень адказнасці за тыя рашэнні, якія нам трэба будзе прыняць на гэтым лёсавызначальным для Радзімы этапе, і гатовы актыўна ўключыцца ў работу па выкананні задач, што стаяць перад Палатай прадстаўнікоў.

СТАР. 5

«НАМ НЕАБХОДНА ВЫБУДАВАЦЬ ПАЛІТЫКУ ТАК, КАБ УТРЫМАЦЬ СВАЮ КРАІНУ, ЯК БЫ НІ БЫЛО ЦЯЖКА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асобна Прэзідэнт спыніўся на супрацьдзеянні кібератакам і даручыў КДБ і іншым праваахоўным структурам надаць гэтаму асаблівую ўвагу.

«Хацеў бы выдзеліць асобна тыя спробы кібератак, якія прымаліся супраць нас. Гэта падобна да біялагічнай зброі ці нават магутней. Не патрэбны ні танкі, ні кулямёты, ні ракеты высокадакладныя. Дастаткова здзейсніць масіраваныя кібератакі на эканамічныя аб'екты, суб'екты любой краіны. І гэтага будзе дастаткова, каб перавярнуць краіну», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Момант ісціны

Расказаў Прэзідэнт і пра спробы зрыву канстытуцыйнай кампаніі. Як механізмы для гэтага выкарыстоўвалася інфармацыйная агрэсія, спробы кібератак на аб'екты жыццезабеспячэння, чыгуначнага транспарту, прамысловасці і энергетыкі, праваахоўныя органы. Але, нягледзячы на гэта, рэферэндум па змене Канстытуцыі правялі без здарэнняў, заўважыў Прэзідэнт.

«Але паглядзіце, якія «надзеі» звязвалі з гэтай падзеяй збеглыя. Распрацаваны экстрэмісцкай арганізацыяй так званы план «Перамога» прадугледжваў арганізацыю серыі тэрактаў на тэрыторыі краіны, што паслужыла б падставай для сацыяльнага выбуху. Хтосьці за мяжой не хаваў, што такой магла б паслужыць правакацыя з гібеллю людзей, святароў ці іншая «сакральная ахвяра». Ад гэтых ідэй яны не адмаўляюцца і сёння. На шчасце, мы трымаем сітуацыю пад кантролем», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, выканаўцам названых планаў «час прызнаць, што свой апошні шанц рэабілітаваць сябе перад спонсарамі яны страцілі ў дзень рэферэндуму».

«Гэта ў іх была гадзіна пік: атрымаецца, выведуць на вуліцу народ, перавернуць краіну — грошы дадуць. Не атрымаецца — грошай не будзе. Таму сёння на галодным пайку гойсаюць па ўсёй планеце ад ЗША да Японіі, каб знайсці грошы. Не атрымаецца. Пачалі пад розныя праграмы, у дадзеным выпадку на вайну ва Украіне. Слухайце, «не вайне, не вайне!» лямантуюць усюды, а фарміруюць батальёны з ачмурэлых беларускіх грамадзян. Пад іх просяць грошы. Зразумела, што калі грошы дыяспара ці хтосьці за мяжой збярэ ці накіруе, то 99 працэнтаў асядзе ў іх кішэнях», — заявіў Прэзідэнт.

Па яго словах, пасля правалу мяцяжу стаўка была зроблена на новых асоб, якія, на думку заходніх куратараў, узначаляць пратэсты, прычынай якіх, па разліках заказчыка, стане эфект ад санкцый.

«То-бок, санкцыі ўзбудзяць народ, і яны потым сядуць на гэтага каня. Павінен сказаць, што нічога з гэтага не атрымаецца. Вы гэта разумееце. Хутка зразумеюць і простыя грамадзяне, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы не ствараем тую прадукцыю, якую немагчыма прадаць на рынках Расіі і Кітая. Я ўжо не кажу пра тое, што мы сёння гандлюем са 100 краінамі ці больш. Але нам дастаткова нават гэтых рынкаў. І тая прадукцыя, якую мы ствараем, дзякуй богу, заўсёды будзе запатрабавана на гэтых рынках».

Мы павінны быць разам

Прэзідэнт нагадаў пра перагаворы прэм'-ер-міністраў Беларусі і Расіі, што адбыліся ў Маскве напярэдадні. Яны ўдакладнілі дамоўленасці, дасягнутыя на мінулай сустрэчы Прэзідэнтаў дзвюх краін.

«Учора скончыліся перагаворы дэлегацый Расіі і Беларусі ў развіццё маёй сустрэчы з Прэзідэнтам Пуціным. Я не стану дэталізаваць, прыйдзе час — раскажам. Але тое, за што мы заўсёды змагаліся з Расіяй, здарылася. Нарэшце ў кіраўніцтва Расіі, ды і ва ўсіх расіян сфарміравалася цвёрдае разуменне, што мы павінны быць разам, што Беларусь гэтаксама патрэбна Расіі, як патрэбна нам велізарная Расія», — падкрэсліў Прэзідэнт.

То-бок, зараз Беларусь будзе атрымліваць энергарэсурсы прыкладна па тых жа коштах, што і расійскія рэгіёны.

«Як я ўжо адзначаў раней, усё, пра што я кажу, гэта новая рэальнасць, у якой нам трэба працаваць і пасля завяршэння аперацыі ў нашай роднай і блізкай нам Украіне. Нашу эканоміку, як і раней, будуць выпрабоўваць санкцыямі. Але мы можам іх пераадолець. Мы іх пераадольваем», — заявіў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што ўсё неабходнае для вытворчасці Беларусь на 90 працэнтаў атрымлівае з Расіі. Гэта ж краіна — асноўны рынак збыту для айчыннай прадукцыі.

Задачы «паўзучай» трансфармацыі

Прэзідэнт заўважае, што кіруемая з Вільнюса, Варшавы, Кіева (а рэальна з Вашынгтона) «пятая калона» — гэта ўжо іншыя людзі, якія навучаюцца пад эгідай спецслужбаў ЗША і краін Заходняй Еўропы ва ўмовах павышанай канспірацыі на тэрыторыі сумежных дзяржаў. Кіраўнік краіны правадзіць аналогію з «абвер-школамі» перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

«Ужо сёння плануецца ўкараненне падрыхтаванай там так званай новай эліты ў розныя сферы нашага грамадства, у дзяржапарат і сілавыя структуры, грамадскія арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі. Ставяцца задачы «паўзучай» трансфармацыі беларускай дзяржавы ў інтарэсах Захаду, распродажу найбольш каштоўных эканамічных актываў, змянення палітычнага курсу краіны», — дадаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адмаўляецца ад запатрабаванасці долара ў айчыннай эканоміцы: насельніцтву не варта абменьваць рублі на амерыканскую валюту.

«Выменялі, нахапаліся. Зараз гэты долар пакрыху пачынае прасядаць. Таму што нікому не патрэбны. Асабліва ў сувязі з гэтымі санкцыямі, якія ўведзены супраць нас. Мабыць, хутка будзем змагацца, каб расійскі рубель быў у кішэні ці юань. Таму што з гэтымі краінамі мы ў асноўным будзем гандляваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, канчатковая мэта ўсіх дзеянняў супраціўнікаў — устараненне Расіі, Кітая як канкурэнтаў на геапалітычнай карце свету, а падзеі, якія адбываюцца вакол Украіны, з'яўляюцца прамым доказам.

Кіраўнік краіны ўпэўнены, што нашу эканоміку, як і раней, будуць выпрабоўваць санкцыямі.

«Спробы запалохаць людзей і схіліць да здрады, каб дэзарганізаваць работу найбольш буйных прамысловых прадпрыемстваў, аб'ектаў транспарту, энергетыкі, сувязі, будуць працягвацца. Інфармацыйная агрэсія будзе павялічвацца. На дыскрэдытацыю дзяржавы ў вачах насельніцтва кінуты вялізныя рэсурсы», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на гэты момант органамі дзяржбяспекі прымаюцца ўсе неабходныя меры па абароне нацыянальных інтарэсаў — дзякуючы зладжанай рабоце сілавога блока па выяўленні і лакалізацыі пагроз на ранняй стадыі паспяхова вырашаюцца задачы ў сферах разведкі, контрразведкі, абароны канстытуцыйнага ладу і процідзеяння тэрарызму.

«Адной з мер абароны працоўных калектываў, студэнцтва, работнікаў аховы здароўя і іншых сацыяльна значных сфер ад дэструктыўнага ўздзеяння з'яўляецца стварэнне надзейнай сістэмы контрразведвальнай абароны дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў. Вы ведаеце, што па гэтым пытанні прыняты канкрэтныя рашэнні, аддадзены распараджэнні ўраду, КДБ і іншым зацікаўленым. У ходзе сённяшняй нарады хацеў бы пачуць, як яны рэалізаваны на практыцы, якія ёсць праблемныя аспекты, што патрабуюць рэагавання на ўзроўні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, у Беларусі ёсць толькі адна «віна» — геапалітычная. «Гасподзь пасяліў нас тут, у цэнтры Еўропы. Не абысці, не аб'ехаць. Здаецца, краіна невялікая, але ўсе ішлі праз яе. Спатыкаліся, падалі, падымаліся, паўзлі, але ішлі, — нагадаў Прэзідэнт. — Так будзе заўсёды. Таму што інтарэсы перасякаюцца праз Беларусь. І нам неабходна выбудаваць палітыку так, каб утрымаць сваю краіну, як бы ні было цяжка».

Ракеты над Прыпяццю

Прэзідэнт Беларусі чарговы раз пацвердзіў, што беларускія войскі не плануюць прымаць удзел у спецаперацыі на тэрыторыі Украіны.

«Мы не збіраемся ўвязвацца ў аперацыю, якую Расія праводзіць ва Украіне, — сказаў Прэзідэнт. — Што мы можам там Расіі дадаць? Датычна асабовага складу, там дастаткова сваіх воінаў. Мы нешта можам Расіі з пункту гледжання ўзбраенняў дадаць? Ды не. Мы гэта ўсё закупляем у Расійскай Федэрацыі. У іх гэта ўсё ёсць, і нават лепшае. Таму нам там рабіць няма чаго».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія войскі выконваюць свае задачы на тэрыторыі Беларусі. «Наша задача — гэта вельмі важна ў любым баі, не толькі ў вайне — папярэдзіць напад з тылу на войскі, якія рухаюцца. Расійскія. Вось гэтага мы ніколі не павінны дапусціць. Ніколі! Гэта будзе падобна на здраду».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка расказаў аб спробе ўдару па тэрыторыі Беларусі ракетай «Кропка-У».

«Літаральна два дні таму назад ноччу пуск чарговы на тэрыторыю нашай Беларусі — удар па нашай тэрыторыі — ракетай «Кропка-У», якую мы паспяхова з расіянамі перахапілі і знішчылі над Прыпяццю, — паведаміў кіраўнік краіны. — Гэта не фэйк — тое, што я вам кажу. Проста мы аб гэтым не казалі. Нам трэба было разабрацца, што там адбываецца».

Прэзідэнт абурыўся: «Яны што, адной ракетай хочуць разбамбіць Беларусь? Ды не атрымаецца. Гэтая ракета проста не даляціць да нас. Але навошта гэта робіцца? Для таго, каб нас узбудзіць і каб мы пачалі адказваць. Але мы не такія прасцячкі. Мы калі адкажам, то адкажам прыстойна ўжо. Што адчуюць усе. Пакуль церпім», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У рамках сустрэчы Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі краіны.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Іван ТЭРТЭЛЬ, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі: «Мы выконваем задачы, якія нам ставяцца кіраўніком дзяржавы, выходзячы з аператыўнай абстаноўкі. Сёння на размове з кіраўніцтвам і аператыўным складам КДБ былі канкрэтызаваныя задачы з улікам абстаноўкі, што складваецца вакол краіны. Мы пастаянна знаходзімся ў баявой сітуацыі. Дзесьці мы прагназавалі развіццё падзей і былі да іх гатовы. Жыццё ўносіць свае карэктывы, і мы павінны разумець, што на нейкіх кірунках нам неабходна сканцэнтраваць асаблівыя намаганні. На сённяшні час гэта разведка. Мы павінны ведаць, што адбываецца ў свеце, дакладаць кіраўніцтву краіны, прымаць рашэнні ў міжнароднай сферы, якія адпавядаюць нашым нацыянальным інтарэсам. Гэта і контрразведка. Мы бачым, што ў адносінах да нашай краіны праводзяцца несяброўскія акцыі. Напрыклад, у сферы кібербяспекі. Мы разумеем, што нашы праціўнікі з замежных спецслужбаў, палітыкастваральныя колы ведаюць, хто і якімі спосабамі гэта ажыццяўляе. Але меры, нягледзячы на міжнароднае заканадаўства, імі не прымаюцца».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сердар Бердымухамедаў перамог на выбарах прэзідэнта Туркменістана

Намеснік старшыні Кабінета Міністраў Туркменістана Сердар Гурбангулыевіч Бердымухамедаў перамог на выбарах прэзідэнта Туркменістана, набраўшы 72,97 працэнта галасоў, паведаміла Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэферэндумаў краіны.

12 сакавіка ў краіне прайшлі выбары прэзідэнта Туркменістана, у якіх прынялі ўдзел 3 362 052 чалавекі, або 97,17 працэнта зарэгістраваных выбаршчыкаў. На вышэйшую дзяржаўную пасаду прэтэндавалі дзевяць кандыдатаў. Інаўгурацыя новага прэзідэнта адбудзецца 19 сакавіка.

Раней, 11 лютага, у Туркменістане адбылося пазачарговае пасяджэнне Халк Маслахаты (верхняя палата парламента Туркменістана), прысвечанае праграме развіцця краіны на наступныя 30 гадоў, у час якога дзеючы прэзідэнт Гурбангулы Бердымухамедаў аб'явіў, што прыйшоў да няпростага рашэння — перадаць дзяржаўнае кіраванне маладым кіраўнікам.

Акрамя таго, Гурбангулы Бердымухамедаў прапанаваў назваць будучы перыяд развіцця Туркменістана «Адраджэнне новай эпохі магутнай дзяржавы». Нагадаем, што цяпер у краіне праходзіць «Эпоха магутнасці і шчасця», якая пачалася ў лютым 2012 года.

У Кіеве ўвялі каменданцкую гадзіну

Каменданцкая гадзіна ўводзіцца ў Кіеве з 20.00 15 сакавіка да 7.00 17 сакавіка (з 21.00 да 8.00 па беларускім часе). Пра гэта паведаміў у Telegram-канале мэр украінскай сталіцы Віталь Клічко.

Паводле яго слоў, зараз па Кіеве будзе забаронена перамяшчацца без спецыяльных пропускаў.

«Выходзіць можна толькі для таго, каб дайсці да сховішча. Каменданцкая гадзіна будзе дзейнічаць да 7 раніцы 17 сакавіка», — удакладніў Клічко.

Кіраўнік горада папрасіў усіх кіяўлян падрыхтавацца да таго, што двое сутак давядзецца быць дома. На выпадак, калі спрацуе трывога, жыхарам Кіева трэба будзе перамясціцца ў сховішча.

Паўночнай Афрыцы прадказалі голад з-за ўкраінскага крызісу

Краінам Паўночнай Афрыкі пагражае голад з-за ўкраінскага крызісу, заявіў кіраўнік Мінсельгаса Францыі Жульен Дэнармандзі ў эфіры радыёстанцыі France Inter.

Міністр прадказаў краінам Паўночнай Афрыкі і Блізкага Усходу голад з-за недастатковай колькасці пшаніцы.

«Сёння ёсць рызыка таго, што мы станем сведкамі голаду, у прыватнасці, на поўначы Афрыкі і Блізкім Усходзе. Егіпет, Марока, Ліван цалкам залежныя ад паставак з РФ і Украіны. Паўстае пытанне, як гэтыя краіны забяспечаць сябе хлебам? Для Егіпта, напрыклад, гэта фундаментальная праблема», — адзначыў Дэнармандзі.

З нагоды

ВАЖНЫ ЭТАП У ЖЫЦЦІ

Дзень Канстытуцыі стаў асабліва святочным для тых, хто атрымаў у гэты дзень свой галоўны дакумент — пашпарт грамадзяніна Беларусі. Дваццаць школьнікаў з усіх рэгіёнаў краіны атрымалі свае першыя пашпарты з рук **кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара СЕРГЕЕНКІ.** Урачыстая цырымонія прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы і стала кульмінацыяй акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі». Героі дня — выдатнікі вучобы, удзельнікі навукова-практычных канферэнцый, пераможцы і прызёры прадметных алімпіяд, рэспубліканскіх спаборніцтваў, фестываляў, конкурсаў, актывісты дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў.

Ігар Сергеенка падкрэсліў, што 15 сакавіка — знакавы дзень у Беларусі. Асабліва сёлета, калі ў сілу ўступаюць змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю, прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме. «Для кожнага з вас гэты дзень стане асаблівым і знамянальным тым, што вы атрымліваеце пашпарты грамадзяніна Беларусі. Гэта дастаткова сур'ёзны этап у жыцці кожнага чалавека. Гэта пуцёўка ў жыццё, чарговая мяжа. Такіх жыццёвых этапаў будзе шмат. Жадаю, каб на вашым шляху сустракаліся добрыя людзі, надзейныя сябры, дасягайце тых мэт, якія будзеце перад сабой ставіць», — звярнуўся ён да школьнікаў, акцэнтаваўшы ўвагу на тым, што быць грамадзянінам Беларусі — не толькі права, але і пэўныя абавязкі перад Айчынай, бацькамі і самім сабой.

Перад цырымоніяй уручэння пашпартоў кіраўнік адміністрацыі Прэзідэнта правёў урок «Канстытуцыя — гістарычны выбар беларускага народа». Разам са школьнікамі яны абмеркавалі гістарычны шлях беларускай дзяржаўнасці, успомнілі імёны славутых беларусаў. Карыстаючыся выпадкам, Ігар Сергеенка праверыў веданне гісторыі ў школьнікаў 10—11 класаў. І хоць на гэтым уроку адзнак не было, падлеткі справіліся на «выдатна». А пасля школьнікі актыўна задавалі свае пытанні кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта. Тэмы самыя розныя: ад асабістых да дзяржаўных.

«Я яшчэ раз упэўніўся, што з моладдзю трэба размаўляць і знаходзіць той фармат, які падыходзіць і дзецям, і людзям старэйшага ўзросту. Я зрабіў для сябе пэўныя высновы, як рыхтавацца, як працаваць і як знаходзіць агульную мову з такой маладой аўдыторыяй», — падзяліўся сваімі ўражаннямі ад сустрэчы з моладдзю Ігар Сергеенка.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ПАЧАТАК ГРАМАДЗЯНСКАГА СТАЛЕННЯ І САМАСТОЙНАСЦІ

На адкрыцці восьмай сесіі Савета Рэспублікі, у дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ўступлення ў дзеянне навацый і дапаўненняў у Асноўны Закон краіны, адбылася ганаровая цырымонія ўручэння пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у рамках усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!». **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА** ўручыла пашпарты запрошаным у Савет Рэспублікі пераможцам конкурсаў, алімпіяд і спаборніцтваў, прадстаўнікам адоранай моладзі ў галіне культуры, навукі і грамадскай дзейнасці.

— Сёння да нас у Савет Рэспублікі прыехалі маладыя людзі, якія з'яўляюцца прыкладам для сваіх аднагодкаў і з гонарам прадстаўляюць кожны свой рэгіён, — адзначыла спікер.

Яна перакананая: атрыманне пашпарта — важная падзея ў жыцці кожнага чалавека.

— Гэта пачатак грамадзянскага сталення і самастойнасці, усведамленне асабістай адказнасці за лёс сваёй краіны, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна акцэнтавала ўвагу на ўнікальнасці сённяшняй гістарычнай падзеі:

— У Дзень Канстытуцыі мы адкрылі сесію, і сімвалічна, што ў гэты дзень мы запрасілі сюды маладых людзей з усіх рэгіёнаў нашай краіны, каб уручыць ім пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Яна павіншавала юных беларусаў з гэтай асаблівай падзеяй у іх жыцці і пажадала ім быць сапраўднымі грамадзянамі і патрыётамі сваёй Радзімы.

Вольга АНУФРЫЕВА.

У АДКАЗЕ ЗА ЛЁС РАДЗІМЫ

У межах патрыятычнай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прымеркаванай да Дня Канстытуцыі, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** ўручыў школьнікам сталіцы пашпарты. Пуцёўкі ў дарослае жыццё ў сценах Палаты прадстаўнікоў атрымалі 20 хлопчыкаў і дзяўчынак, сярод якіх — выдатнікі вучобы, пераможцы і прызёры шматлікіх спаборніцтваў і фестываляў, конкурсаў, алімпіяд.

Пажадаўшы ім быць сапраўднымі патрыётамі краіны, спікер ніжняй палаты парламента адзначыў, што атрыманне пашпарта — важная і ўрачыстая падзея ў жыцці кожнага чалавека. «Атрымліваючы пашпарт, памятайце, што не толькі дзяржава адказвае за ваш лёс, а і вы несяце адказнасць за лёс сваёй краіны, — звяртаючыся да юных грамадзян, заўважыў ён. — Любіце Радзіму і ведайце, што менавіта ад вас, вашага розуму, таленту, працавітасці і актыўнай грамадзянскай пазіцыі залежаць яе будучыня, дабрабыт і бяспека».

Вераніка КАНЮТА.

Падарунак да свята

Да Дня Перамогі асобныя катэгорыі грамадзян атрымаюць матэрыяльную дапамогу

У адпаведнасці з пастановай Саўміна, на выплаты могуць разлічваць тыя атрымальнікі пенсій ад Беларусі і (або) з іншых дзяржаў, якія пастаянна жывуць у нашай краіне.

Для інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама асоб, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года, памер дапамогі складзе 1,8 тысячы беларускіх рублёў. Выплату такога ж памеру атрымаюць і грамадзяне, якія ў складзе спецыяльных фарміраванняў удзельнічалі ў размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах.

Па тысячы беларускіх рублёў выплацяць грамадзянам, якія маюць ордэны або медалі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай. На такую ж матэрыяльную дапамогу могуць разлічваць і тыя, хто падчас вайны працаваў на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абаронных збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектах у межах тылавых граніц дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог. Такія ж выплаты вызначаны і для тых, хто працаваў на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях Ленінграда ў час блакады з 8 верасня 1941 да 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда», а таксама для ўзнагароджаных знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда».

Матэрыяльную дапамогу ў памеры 750 беларускіх рублёў атрымаюць члены сем'яў ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі, зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны: муж або жонка, якія не ўзялі новы шлюб, дзеці-інваліды з дзяцінства, у тым ліку ўсыноўленыя, удачароныя, іншыя ўтрыманцы, якім заканадаўствам установлена павышэнне пенсіі па названых падставах. Такая ж выплата прадугледжана і для былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, для інвалідаў з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў гады вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў.

Матэрыяльная дапамога будзе выплачана з 25 красавіка да 6 мая.

Вераніка КАНЮТА.

Падзея

НЕ ЖАНОЧАЯ СПРАВА?

На форуме ў сталіцы прадстаўніцы БСЖ выказалі сваю грамадзянскую пазіцыю

Напярэдадні дня Канстытуцыі ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі прайшоў маштабны жаночы форум «Захоўваем гістарычную памяць. Ствараем найноўшую гісторыю краіны». У ім узяло ўдзел каля тысячы жанчын, сярод іх медыкі, педагогі, вучоныя, работнікі сталічных прадпрыемстваў. Ганаровымі гасцямі сталі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец, начальнік галоўнага ўпраўлення інфармацыйнай палітыкі і грамадскага развіцця Адміністрацыі Прэзідэнта Таццяна Шэндзік, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, намеснік міністра эканомікі Таццяна Брынцэвіч.

Тое, што жаночы форум прайшоў напярэдадні Дня Канстытуцыі, — не выпадковасць. Жанчыны бралі актыўны ўдзел у распрацоўцы і абмеркаванні Асноўнага Закона нашай краіны.

— Для нас 15 сакавіка — асаблівы дзень. Мы пачынаем работу чарговай, восьмай сесіі Савета Рэспублікі ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй, — адзначыла Наталля Качанава. — Сімвалічна, што гэта адбывацца менавіта ў Дзень Канстытуцыі. Безумоўна, абноўленая Канстытуцыя — гэта новы этап у развіцці нашай дзяржавы і знакавая падзея для ўсіх нас, жыхароў Беларусі.

Як адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, стаўленне да жанчын у нашай краіне асаблівае. Улады, Прэзідэнт краіны заўсёды ўдзяляюць асаблівую ўвагу жанчыне-маці, жанчыне-працаўніцы, жанчыне-стваральніцы.

— Форум яшчэ раз дае магчымасць сказаць, што мы, жанчыны, — адзіныя. Мы за родную квітнеючую Беларусь, за мір і згоду, добрае стаўленне да дзяцей, сям'і і тых сямейных каштоўнасцяў, якія цяпер замацаваныя ў Канстытуцыі, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Жанчыны актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні Асноўнага Закона нашай краіны. Для ўсіх іх было важным захаванне ў Канстытуцыі духоўных і маральных традыцый, гістарычнай памяці, дадала Наталля Качанава.

Старшыня Беларускага саюза жанчын, старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Алена Богдан адзначыла, што ёсць намер зрабіць такія форумы традыцыйнымі:

— Мерапрыемствы ў падтрымку тых змяненняў, якія ўнесены ў Канстытуцыю, прайшлі па ўсёй краіне. Цяперашні форум выказа словы падтрымкі развіццю нашай краіны, захаванню сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Фінальнымі акцыямі стануць «Жанчына года» і рэспубліканскі жаночы форум. Мы хочам зрабіць яго добрай традыцыяй Беларускага саюза жанчын.

Як адзначыла Алена Богдан, Мінская гарадская арганізацыя — адна з самых моцных у складзе Беларускага саюза жанчын. У яе шэрагах жанчыны-лідары ў розных галінах і прафесіях, незалежна ад пасад.

Старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын, старшыня галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Вольга Чамаданава расказала пра мэты жаночага форуму.

— У беларускіх жанчын ёсць магчымасць аб'яднацца і кансалідаваць свае намаганні для таго, каб Беларусь стала яшчэ мацнейшай. Мы можам прымножыць нашы дасягненні, каб перадаць нашу суверэнную і незалежную краіну будучым пакаленням. Нездарма наш сённяшні форум называецца «Захоўваем гістарычную памяць. Ствараем найноўшую гісторыю краіны». Бо Канстытуцыя, якая 15 сакавіка набывае моц, — гэта і ёсць падмурак для далейшага развіцця нашай краіны, які мы закладваем на дзесяцігоддзі.

Вольга Чамаданава падкрэсліла, што прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын бяруць дзейны ўдзел у грамадскім жыцці і выказваюць сваю грамадзянскую пазіцыю.

— Сёння ў нас ёсць магчымасць сказаць сваё важкае жаночае слова аб тым, што мы за нашу краіну. Нам не патрэбныя войны, мы хочам жыць у мірнай і спакойнай краіне. Беларускі саюз жанчын — гэта моцная каманда, здольная браць удзел у розных праектах, мерапрыемствах і ў цэлым кансалідаваць грамадства. Лічыцца, што гэта не жаночая справа — так актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці і выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю. Сёння мы сустракаем шмат фэйкаў і лжывай інфармацыі, і мы гатовыя адсочваць дакладную інфармацыю і аб'ектыўна даносіць яе да беларусаў. І мы зробім усё, што ў нашых сілах, для захавання нашай суверэннай краіны, — сказала яна.

Па выніках форуму ўдзельніцы прынялі рэзалюцыю. У дакументе ідзе гаворка аб умацаванні ролі жаночай арганізацыі, міжнароднай салідарнасці жанчын у імя ўстойлівага развіцця, бяспекі і працвітання.

Алена КРАВЕЦ.

Максімальная самаадданча, мабілізацыя ведаў і прафесіяналізму

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота БелТА.

Мы бачым, як паўсюдна дэвальвуецца давер, як імкліва нарастаюць агрэсія і нянавісць, як разбураюцца выбудаваныя дзесяцігоддзямі прынцыпы міжнароднага супольнага жыцця і мірнага суіснавання, як дэградуе сістэма бяспекі, як страчваюцца добрыя чалавечыя сувязі.

Неаднаразова задумваюся над тым, што кожнаму пакаленню беларусаў выпала на долю нейкае выпрабаванне. Адны — змагаліся за незалежнасць, іншыя — аднаўлялі беларускія гарады і вёскі пасля ваеннай разрухі, а ў 1990-я пасля развалу СССР — стваралі суверэнную дзяржаву. Для сённяшняга пакалення, асабліва моладзі, напэўна, самае важнае і складанае — гэта захаваць свой унутраны стрыжань, не паддацца гэтаму вар'яцтву, якое непрыкрыта насаджае калектыўны Захад, не развучыцца адрозніваць рэчаіснасць ад усяго таго, што вывяргаюць пад выглядам праўды медыярэсурсы, якія фінансуюцца з-за мяжы.

Бо на самай справе пытанне нават не ў Беларусі.

Кожны павінен для сябе ўразумець і давесці да людзей тры ключавыя пазіцыі. Па-першае, мы не здраднікі і здраднікамі не будзем ніколі. Па-другое, беларускай тэхнікі і беларускіх вайскоўцаў на Украіне няма, а калі мы і будзем ваяваць, то за сваю краіну і на сваёй тэрыторыі. У гэтым выпадку пад ружжо ўстануць усе, недатыкальных у нас няма. І, нарэшце, наш Прэзідэнт робіць усё магчымае, а часам і немагчымае, каб не было вайны.

У цяперашніх умовах мы павінны сканцэнтраваць свае намаганні на далейшым збліжэнні з Расійскай Федэрацыяй у эканоміцы, ваеннай сферы і сферы бяспекі, па гуманітарных кірунках развіцця. Далейшае нарошчванне супрацоўніцтва з нашым стратэгічным саюзнікам з'яўляецца прыярытэтам на двухбаковым трэку міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Адносіны Беларусі і Расіі павінны стаць эталонам для ўзаемадзеяння з дзяржавамі ў складзе інтэграцыйных аб'яднанняў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Еўразійскага эканамічнага саюза. Мы нацэлены на захаванне і пашырэнне існуючых цесных парламенцкіх сувязяў з дружалюбнымі нам краінамі на постсавецкай прасторы.

У сітуацыі, калі краіны Захаду ад нас закрываюцца, усяляк спрабуюць ізаляваць Беларусь і Расію, жыццё не спыняецца. Любыя выклікі неабходна разглядаць як новыя магчымасці. Нам трэба будзе пераарыентавацца на азіяцкі вектар.

Нашым прыярытэтам у гэтым рэгіёне з'яўляецца паглыбленне супрацоўніцтва з Кітаем. Мы прадоўжым мерапрыемствы па развіцці ўзаемадзеяння з кіраўніцтвам Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў і па лініі маладзёжных і жаночых арганізацый. Нашы ўзаемаадносіны ў абазначаных галінах складваюцца вельмі прадукцыйна, за што мы ўдзячныя нашым кітайскім сябрам.

У азіяцкім напрамку парламентарыі павінны працаваць на апярэджанне — у найкарацейшыя тэрміны неабходна актуалізаваць кантакты з калегамі, прааналізаваць існуючую нарматыўную базу на прадмет яе дастатковасці і гібкасці для забеспячэння рэалізацыі ўрадам і гаспадарчымі структурамі канкрэтных праектаў у розных галінах. Заканадаўчая работа павінна не толькі адпавядаць надзённым патрэбам, але і стымуляваць развіццё двухбаковых і шматбаковых адносін на ўзаемавыгаднай аснове.

Ва ўмовах нарастаючай канфрантацыі ў сусветнай палітыцы і ссоўвання геапалітычных прыярытэтаў у разы ўзрастае значэнне міжнароднай парламенцкай дыпламатыі, здольнай збліжаць краіны і народы, апярэджваць канфліктныя сітуацыі ў адносінах паміж дзяржавамі і дзяржаўнымі аб'яднаннямі. Члены Савета Рэспублікі павінны задзейнічаць усе існуючыя парламенцкія магчымасці для абароны і прасоўвання нашых нацыянальных інтарэсаў на міжнароднай арэне.

З прыняццем абноўленай Канстытуцыі не варта чакаць імгненных змен у нашым жыцці — сёння мы прачнуліся ўсё ў той жа роднай і любімай Беларусі. Працэс удасканалення навацыі шматэтапны. Для гэтага спатрэбіцца кансалідацыя намаганняў усяго грамадства, кожнага з нас на сваім месцы. Цяпер гэта наш маральны доўг, абавязак, стымул рухацца наперад і наша нацыянальная ідэя.

Для парламентарыяў надыходзіць перыяд актыўнай, карпатлівай заканатворчай работы. Мы павінны прывесці ўсе заканадаўчыя і падзаконныя акты ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй, па сутнасці — нанова выбудаваць іерархію нарматыўных прававых актаў. І тады Асноўны Закон будзе паўнацэнна і паспяхова працаваць для многіх пакаленняў беларусаў.

У новых рэаліях заканадавец — гэта не проста спецыяліст, здольны надаць думцы юрыдычную форму. Цяпер мы павінны адпавядаць значна больш важкім патрабаванням: умець працаваць з грамадскай думкай, генерыраваць ідэі, юрыдычна іх афармляць, суправадзіць законапраект да лагічнага завяршэння, аж да яго рэалізацыі на практыцы. Калі будзеце бачыць, што ёсць недапрацоўкі ці шурпатасці, значыць, спыняцца нельга — ініцыіруйце далейшае ўдасканаленне гэтай прававой сферы.

Нам, парламентарыям, працаваць трэба як ніколі хутка, дакладна і высокапрафесійна. Думаць трэба аналітычна. Якасная юрыдычная тэхніка — гэта нашы настройкі па ўмаўчанні. З улікам планаванага аб'ёму, складанасці, важнасці работы і наяўнага часавога люфту — па-іншаму нельга. Ад таго, як мы з вамі адпрацуем найбліжэйшыя два гады, непасрэдна залежыць далейшы ход канстытуцыйных пераўтварэнняў.

Адным з самых важных кірункаў работы Савета Рэспублікі — палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва — з'яўляецца работа з насельніцтвам. Мы, члены Савета Рэспублікі, павінны быць максімальна ўцягнуты ў жыццё людзей ва ўсіх кутках краіны, ведаць іх праблемы і прапаноўваць магчымыя рашэнні. Асабліва цяпер, калі ўсім — маладым і старэйшым, навучэнцам, працоўным і пенсіянерам, у горадзе і сельскай мясцовасці, і нам з вамі — дзяржаўным служачым — даводзіцца, што называецца, «выходзіць з зоны камфорту» і вучыцца жыць у зменлівых умовах.

Часам людзям сапраўды складана самастойна разабрацца ў перыпетыях сённяшняга дня, справіцца з гібрыднымі атакамі нашых злаславіцуаў. Таму на першы план выходзіць тлумачальная работа з насельніцтвам — людзі павінны ведаць праўду, мець магчымасць планаваць будучыню і разлічваць уласныя сілы.

Яшчэ адзін прыярытэт Савета Рэспублікі ў рабоце з людзьмі — разгляд зваротаў. Мы нясём адказнасць за якасць жыцця людзей па ўсёй краіне, за сацыяльнае самаадчуванне рэгіёнаў, а значыць — абавязаны ўключацца ў вырашэнне праблем нашых грамадзян. Сёння няма пытанняў не нашых! Усё, што хвалюе людзей, — гэта кампетэнцыя Савета Рэспублікі.

Паралельна з разглядам зваротаў членам Савета Рэспублікі неабходна выконваць задачы па маніторынгу цэн у гандлёвых сетках, аптэках, кантролі за своечасовай выплатай заработнай платы. Члены Савета Рэспублікі на пастаяннай аснове аказваюць садзейнічанне грамадзянам у працаўладкаванні на прадпрыемствах у рэгіёнах. Для людзей гэта — пытанні сацыяльнай справядлівасці.

Працягвайце выкарыстоўваць усе магчымасці дзяржаўных СМІ, афіцыйных рэсурсаў Савета Рэспублікі, асабістыя старонкі ў сацыяльных сетках. Але не забывайце — нішто не заменіць жывых чалавечых зносін. У непасрэдным асабістым кантакце «вочы ў вочы» — ёсць шанц дастукацца да кожнага і данесці сваю пазіцыю. Менавіта праз жывыя чалавечыя стасункі ў нас ёсць шанц выпрацаваць народны імунітэт да фэйкаў, хлусні ды фальшу і разам супрацьстаяць разгорнутай супраць Беларусі гібрыднай вайне.

Не менш важным кірункам у нашай рабоце з'яўляецца грамадская дзейнасць. На ўласным прыкладзе мы павінны паказваць людзям канструктыўную грамадзянскую пазіцыю, вучыць іх наладжваць нармальныя чалавечыя адносіны і весці цывілізаваны дыялог.

Відавочна, што сёння наспела патрэба ў адзінай нацыянальнай канцэпцыі развіцця грамадзянскай супольнасці, стаўпамі якой выступаюць нашы асноўныя грамадскія аб'яднанні. Папярэдне трэба абагульніць назапашаны досвед дзейнасці грамадскіх структур у нашай краіне, выпрацаваць адзіныя падыходы да забеспячэння грамадзянскага ўдзелу ў прыняцці ключавых рашэнняў.

Лічу правільным даць магчымасць усім грамадскім інстытутам выказаць сваё меркаванне па дадзеным пытанні. Прапаную падумаць аб арганізацыі на базе Савета Рэспублікі пляцоўкі для збору і абмеркавання ідэй і канкрэтных ініцыятыў па развіцці грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Такая пляцоўка можа стаць пастаянна дзеючым сувязным звяном паміж прадстаўнікамі ўлады і грамадзянскай супольнасці пры рэалізацыі стваральных праектаў і ініцыятыў.

Прынцыпова важна, каб у грамадскім жыцці ўзрасла роля моладзі. Матываваная, адукаваная, актыўная моладзь — гэта стратэгічны рэсурс любой краіны. Неабходна больш актыўна ўцягваць моладзь у сацыяльна карысную дзейнасць праз органы самакіравання, грамадскія аб'яднанні маладзёжнай накіраванасці, маладзёжныя саветы і парламенты.

На цяперашнім этапе перад Саветам Рэспублікі стаяць сур'ёзныя задачы, вырашэнне якіх запатрабуе максімальнай самаадданчы, мабілізацыі ўсіх нашых ведаў і прафесіяналізму, жорсткага парадку і выканаўчай дысцыпліны.

Нас чакае напружаная работа па ажыццяўленні канстытуцыйных навацый, дасягненні абазначаных кіраўніком дзяржавы ў ходзе Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь мэт і прыярытэтаў, далейшай рэалізацыі рашэнняў шостага Усебеларускага народнага сходу, Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Па-першае, прынцыповае і рашучае адстойванне нацыянальных інтарэсаў на міжнароднай арэне, давядзенне праўдзівай інфармацыі аб сітуацыі ў Беларусі і палітычным курсе, які праводзіцца кіраўніцтвам нашай краіны, любымі магчымымі спосабамі, максімальнае выкарыстанне магчымасцяў парламенцкай дыпламатыі.

Па-другое, прывядзенне нацыянальнай прававой сістэмы ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй, інтэнсіфікацыя працэсаў уніфікацыі, гарманізацыі і збліжэння заканадаўстваў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, актыўны ўдзел у выпрацоўцы мадэльных законаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, а таксама ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства з улікам выклікаў і патрабаванняў часу.

Па-трэцяе, працяг маштабнай тлумачальнай работы па канстытуцыйных навацыях, правядзенне сустрэч з працоўнымі калектывамі і грамадзянамі па месцы жыхарства, уважлівае стаўленне да кожнага звароту, уцягванне моладзі ў сацыяльна карысную дзейнасць.

Па-чацвёртае, прыцягненне канструктыўных грамадзянскіх структур і ініцыятыў, сумесная рэалізацыя праектаў па выхаванні грамадства адукаваных і свядомых грамадзян, актыўная работа са сродкамі масавай інфармацыі.

Як сказаў наш Прэзідэнт, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, «не мае значэння — займаем мы высокую пасаду, вырошчваем хлеб, пішам карціны або робім навуковыя адкрыцці, сучасны свет прымушае кожнага больш актыўна ўключацца ў палітычнае жыццё і мысліць дзяржаўна. Сёння, калі хочаце, гэта адзіна правільны шлях да захавання свайго суверэннага права жыць і развівацца як нацыя на сваёй гістарычнай зямлі».

Упэўненая, што мы зробім усё магчымае для далейшага развіцця і працвітання роднай Беларусі.

Міру і дабра нашай любімай Радзіме!

Поўны тэкст выступленняў спікераў парламента чытайце на сайце zviazda.by

Час новых рашэнняў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэба сказаць, што мы звязаныя дастаткова жорсткімі часавымі рамкамі і любое прамаруджванне ў дасягненні пастаўленых мэт цягне сур'ёзныя выдаткі для краіны, грамадзян, нашай агульнай будучыні.

Найважнейшая задача сёння — пачаць сістэмную работу па прывядзенні дзеючага заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй. На працягу двух гадоў трэба адкарэкціраваць каля 100 законаў, уключаючы 20 кодэксаў Рэспублікі Беларусь. Таму нам прынцыпова важна дакладна расставіць прыярытэты заканадаўчай дзейнасці і вызначыцца з графікам іх рэалізацыі.

Ужо сёлета мы павінны прыняць законы аб Усебеларускім народным сходзе і грамадзянскай супольнасці. Законы складаныя, але з-за іх асаблівай запатрабаванасці ў найбліжэйшы час трэба забяспечыць іх падрыхтоўку і ўнясенне ў Палату прадстаўнікоў. Пэўныя напрацоўкі ў дэпутатаў маюцца, і іх рэалізацыю трэба паскорыць.

Самую пільную ўвагу трэба ўдзяліць удзелу дэпутацкага корпуса ў падрыхтоўцы паправак у законы аб Прэзідэнце, урадзе, а таксама ў Выбарчы кодэкс.

У аператыўным парадку неабходна скарэкціраваць і асноўныя для нас прававыя дакументы — законы аб Нацыянальным сходзе, аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, а таксама ўнесці змяненні ў Рэгламент Палаты прадстаўнікоў.

Натуральна, прывядзенне дзеючых законаў у адпаведнасць з Канстытуцыяй — гэта толькі адзін са складнікаў работы па трансфармацыі заканадаўства. Дэпутаты павінны ўзяць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Канцэпцыі прававой палітыкі, якая вызначае стратэгію ўдасканалення нацыянальнай прававой сістэмы на новы перыяд.

Улічваючы характар будучай работы, пастаянным камісіям трэба забяспечыць дакладнае планаванне і цесную каардынацыю сваіх дзеянняў з Адміністрацыяй Прэзідэнта, урадам, іншымі зацікаўленымі органамі.

Работа будзе напружаная. Аднак гэта не павінна адбіцца на якасці вырашэння нашых бягучых задач, разглядзе законапраектаў, якія знаходзяцца ў пастаянных камісіях або будуць унесены ў Палату прадстаўнікоў у адпаведнасці з планам іх падрыхтоўкі на 2022 год.

Няпэўная знешнепалітычная абстаноўка абавязвае нас прыняць усе неабходныя прававыя меры, каб забяспечыць эканамічную бяспеку краіны і захаваць годны ўзровень жыцця беларусаў.

На нашых вачах разбураецца старая сістэма светагаспадарчых сувязяў. Перакройваюцца сусветныя рынкі. Разрываюцца лагістычныя, тэхналагічныя і фінансавыя ланцужкі. А гандлёва-эканамічныя войны і санкцыі ўжо ўшчыльную падвялі свет да катастрофы.

Зразумела, Беларусь валодае сур'ёзным запасам трываласці. Але трэба адаптаваць нацыянальную эканоміку да работы ў гэтых жорсткіх і часам непрадказальных умовах, забяспечыўшы пры гэтым захаванне яе стратэгічных галін, ключавых вытворчасцяў і рабочых месцаў.

На гэта павінна быць накіравана і наша работа над праектам Закона аб рэспубліканскім бюджэце. Ужо цяпер варта рыхтаваць канкрэтныя прапановы. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, неабходна захаваць сацыяльную накіраванасць бюджэту. У гэтым плане важна задзейнічаць тую інфармацыю, якая была абагульнена намі ў ходзе грамадскага абмеркавання праекта змяненняў у Канстытуцыю на дыялогавых пляцоўках, у працоўных калектывах.

Наряўне з забеспячэннем падтрымкі прадпрыемстваў дзяржаўнага сектара неабходна прапрацаваць дзейсныя меры па захаванні і развіцці прыватнага бізнесу, які ўносіць істотны ўклад у эканоміку краіны.

Трэба ўважліва вывучыць прапановы аб дзяржаўным стымуляванні дзелавой ініцыятывы, заахвочванні прадпрымальніцкай дзейнасці.

З улікам чаканняў грамадзян павінна быць вырашана і задача па ўдасканаленні зямельных адносін. Справядлівыя базавыя правілы распараджэння зямлёй — падмурак сацыяльнай стабільнасці. Менавіта з пазіцыі гэтага тэзіса кіраўніка дзяржавы неабходна падысці да карэкціроўкі Кодэкса аб зямлі.

Падрыхтоўку і прыняцце рашэнняў па забеспячэнні эканамічнай бяспекі трэба цесна ўвязаць з удзелам парламентарыяў у рэалізацыі 28 саюзных праграм, бо само жыццё пацвярджае правільнасць лініі лідараў дзвюх нашых краін на больш цеснае супрацоўніцтва.

Што датычыцца першачарговых задач па рэалізацыі знешнепалітычнага курсу краіны, то сёння яны перш за ўсё абумоўлены нарастаннем найглыбейшага крызісу, які адбыўся ў адносінах Усходу і Захаду.

Мы ўвесь час казалі аб недапушчальнасці палітыкі санкцый, ціску і пагроз, аб тым, як небяспечна ігнараваць прынцып непадзельнасці бяспекі. Беларусы, якія сталі ахвярамі нацысцкага генацыду, не прымаюць вайну на ўзроўні генетычнай памяці. І нават сёння, калі свет стаіць на мяжы ядзернага канфлікту, мы актыўна выступаем за стварэнне надзейных механізмаў забеспячэння глабальнай бяспекі і фармаванне справядлівай і ўзаемавыгаднай сістэмы эканамічнага супрацоўніцтва. Аб гэтым сведчаць намаганні кіраўніка беларускай дзяржавы па стварэнні ўмоў для прававзнення мірных перагавораў паміж Украінай і Расіяй, а перш за ўсё — яго ініцыятыва аб перазапуску Хельсінкскага працэсу, вылучаная яшчэ пяць гадоў назад.

Цалкам відавочна, што іншай альтэрнатывы гэтай мірнай ініцыятыве сёння не існуе. Таму не актыўнае прасоўванне на ўсіх узроўнях і ва ўсіх фарматах міжнароднага парламенцкага дыялогу застаецца нашай галоўнай задачай на знешнім контуры. Глыбока перакананы, што выхад з існуючай сітуацыі магчымы толькі на шляху яе рэалізацыі. Шчыра спадзяюся, што заходнія палітыкі расплюшчаць вочы на гэта і мы ўбачым з іх боку рэальныя крокі ў дадзеным кірунку.

Цяпер трэба засяродзіцца на развіцці ўсебаковых адносін з нашымі саюзнікамі і партнёрамі перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай сферы. Беларусь — экспартаарыентаваная краіна. Таму праблемы ў сусветнай эканоміцы сапраўды ствараюць для нас пэўныя цяжкасці. Але разам з тым яны маюць у сабе і патэнцыяльныя магчымасці. Адшукаць іх і выкарыстаць у сваіх інтарэсах надзвычай важна.

З улікам санкцый супраць Беларусі трэба дакладна вызначыць групы краін, з якімі мы можам засяродзіцца выключна на палітычным аспекце дыялогу, і тыя дзяржавы, дзе гэты дыялог можа прынесці рэальную эканамічную аддачу. Гэта павінна стаць дарожнай картай нашай далейшай дзейнасці, і Пастаянная камісія па міжнародных справах ва ўзаемадзеянні з МЗС трэба аператыўна заняцца яе распрацоўкай.

Пастаянны рост цэн на харчаванне кажа аб тым, што попыт у свеце на яго ў найбліжэйшыя гады не зменшыцца. Трэба выкарыстоўваць гэту сітуацыю для раскрыцця экспартнага патэнцыялу нашай краіны як аднаго з найбуйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Я звяртаюся да кіраўнікоў парламенцкіх груп дружбы — гэтыя пытанні павінны быць на вашым персанальным кантролі.

Неабходна больш актыўна садзейнічаць прасоўванню айчынных тавараў на рынкі Расіі і Кітая. Усе ўмовы для гэтага створаны ў рамках дамоўленасцяў па Саюзнай дзяржаве, а таксама Дырэктывы аб развіцці двухбаковых адносін з КНР.

Трэба ўмацоўваць кантакты з нашымі традыцыйнымі партнёрамі па СНД і ЕАЭС, краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі, Блізкага Усходу, прапрацаваць перспектывы рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на палях 36-й асамблеі Лацінаамерыканскага парламента, якая прайшла ў Панаме ў лютым гэтага года. Гаворка, у прыватнасці, ідзе аб магчымасці падпісання Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Беларусі і Парламентам МЕРКАСУР.

Што датычыцца нашага ўдзелу ў рабоце па лініі Міжпарламенцкага саюза і ПА АБСЕ, то тут трэба зрабіць акцэнт на аб'яднальных ініцыятывах гуманітарнага характару. Пры гэтым мы павінны жорстка рэагаваць на любыя варожыя выпады супраць Беларусі, распаўсюджванне хлусні і спробы працягвання на міжнародных парламенцкіх пляцоўках надуманых антыбелорускіх рэзалюцый.

Нельга зніжаць і набраныя тэмпы зносін з выбаршчыкамі. Людзі хочуць працягваць дыялог. І наш абавязак — зрабіць так, каб яны з першых вуснаў даведваліся аб развіцці сітуацыі вакол Беларусі і ходзе канстытуцыйнай рэформы.

Пры гэтым важна дзейнічаць максімальна адкрыта, бо недахоп інфармацыі адразу ж запаўняецца нашымі апанентамі. А ў чым заключаюцца іх сапраўдныя мэты, усе ўжо цудоўна разумеюць.

Трэба тлумачыць грамадзянам, дзе праўда, а дзе хлусня, развенчваць фэйкі, даводзіць пазіцыю ўлады па найважнейшых пытаннях знешняй і ўнутранай палітыкі. А самае галоўнае — бачыць праблемы і з мясцовымі ўладамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў вырашаць іх, не дапускаючы сацыяльнай напружанасці.

Безумоўна, неабходна прадоўжыць маніторынг цэн на сацыяльна значныя тавары і паслугі, адсочваць работу мясцовых органаў улады па вырашэнні сацыяльных пытанняў, асабліва па падтрымцы найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва — пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетных сем'яў.

Прычым важна не проста канстатаваць праблемныя пытанні, але і прадумваць алгарытмы іх вырашэння. Інфармацыю, сабраную дэпутатамі, трэба сур'ёзна аналізаваць і на сістэмнай аснове рыхтаваць канкрэтныя прапановы ў адрас мясцовых уладаў, урада, а таксама вылучаць адпаведныя заканадаўчыя ініцыятывы.

Паважаныя ўдзельнікі пасяджэння!

Завяршаючы сваё выступленне, хачу сардэчна павіншаваць вас, нашых выбаршчыкаў, чыю падтрымку мы адчувалі на ўсіх этапах грамадскага дыялогу, з Днём Канстытуцыі і пажадаць усім нам поспехаў у яе рэалізацыі.

Поўны тэкст выступленняў спікераў парламента чытайце на сайце zviazda.by.

Парламенцкі дзённік

ПА АБНОЎЛЕНЫМ РЭГЛАМЕНЦЕ

Пачала работу восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання

Сімвалічна, што новы сезон у заканатворчай дзейнасці стартаваў у адно з найважнейшых дзяржаўных свят — Дзень Канстытуцыі. Не менш знакава, што менавіта ўчора ўступіла ў сілу рашэнне рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон краіны.

Фота БелТА.

Як заўважыла **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святлана ЛЮБЕЦКАЯ,** з улікам вынікаў усенароднага галасавання, якое адбылося, і ўступлення ў дзеянне абноўленай Канстытуцыі парламент пачынае сваю работу па абноўленым рэгламенце. «Пасяджэнне сесіі адбылося ў сувязі з новым рэжымам работы, калі Палата прадстаўнікоў будзе працаваць у аднасесіённым перыядзе, — раскрыла дэталі сесіі, якая пачала сваю работу, парламентарый. — Гэта мае на мэце ўстанавіць сістэмную, на пастаяннай аснове работу заканадаўцаў для таго, каб максімальна аператыўна, эфектыўна ва ўзаемадзеянні з усімі органамі, што надзеленыя правам заканадаўчай ініцыятывы, вырашаць тыя прававыя пытанні, якія будуць узнікаць на парадку дня. Натуральна, што ўступленне ў дзеянне абноўленай Канстытуцыі — першы этап заканадаўчага рэгулявання, фармалізацыя тых канцэптуальных палажэнняў, якія былі адобраны на ўсенародным галасаванні. Цяпер нас чакае не менш важны, а можа, і больш адказны перыяд у рэалізацыі тых палажэнняў, якія фармалізаваны. І ад таго, наколькі зладжана, узважана, разумна, спакойна і якасна спрацуюць усе зацікаўленыя, у тым ліку ўпаўнаважаныя органы, калі адзіная калектыўная адказнасць пакажа свае вынікі, тады мы будзем лічыць, што тыя задачы, якія былі пастаўлены падчас прапрацоўкі асноўных змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, вырашаюцца».

Па словах дэпутата, на прывядзенне ў адпаведнасць з заканадаўствам абноўленай Канстытуцыі даецца ў цэлым два гады, аднак гэта не азначае, што агучаны перыяд будзе канчатковым. «Гэта карпатлівая, пастаянная работа, якую парламент ужо распачаў, па аўдыце заканадаўства, якое павінна быць адкарэкціравана, прычым тэрміны павінны быць максімальна аператыўнымі, — удакладніла Святлана Любецкая. — Ужо сёння вядзецца работа над Грамадзянскім кодэксам з улікам змяненняў, якія ўступілі ў сілу, спецыяльным заканадаўствам, якое датычыцца дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, Закона «Аб грамадзянскай супольнасці», для таго каб забяспечыць базу для фармалізацыі тых палажэнняў, ад якіх будзе залежаць зладжаная і эфектыўная работа Усебеларускага народнага сходу як найвышэйшага прадстаўнічага органа».

У сваю чаргу, у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі, Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе» парламентарыі павінны распрацаваць і прыняць на працягу года.

Учора падчас першага пасяджэння восьмай сесіі былі разгледжаны пытанні аб ратыфікацыі важных дакументаў. У другім чытанні на абмеркаванне быў вынесены законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб племянной справе ў жывёлагадоўлі». У першым чытанні дэпутаты разгледзелі законы «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі», «Аб змяненні законаў» (па пытаннях крымінальнай адказнасці), «Аб змяненні законаў па пытаннях бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці».

Як паведаміла **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Святлана БАРТАШ,** апошні законапраект вельмі своечасовы. «Мы жывём у перыяд росту інфармацыйных тэхналогій, — заўважыла дэпутат. — Інфармацыя сёння з'яўляецца самым істотным момантам у развіцці эканомікі, прыцягненні інвестыцый і стварэнні спрыяльнага інвестыцыйнага клімату ў краіне. Паказаць дакладную справаздачнасць, якая адпавядае міжнародным стандартам, вельмі важна і актуальна».

Вераніка КАНЮТА.

Кадры для сяла

Прызыў найлепшых на аграслужбу

На Гомельшчыне рыхтуюць да запуску пілотны праект, аналагаў якому ў Беларусі яшчэ няма. Сутнасць — падтрымка здольных маладых людзей, якія маюць стартавы прафесійны досвед працы ў сельскай гаспадарцы, хочуць расці і развівацца ў прафесіі. Удзельнікам праекта гарантаваны ўсебаковая практычная і тэарэтычная падрыхтоўка, магчымасць павысіць свой прафесійны ўзровень на пасадзе намесніка кіраўніка найлепшых гаспадарак вобласці. Ініцыятыва належыць старшыні Гомельскага аблвыканкама Івану КРУПКО.

Старт праекта запланаваны на першага красавіка, а працягласць работы з удзельнікамі разлічана на шэсць месяцаў. Усе нюансы такой падрыхтоўкі перспектыўных кіраўнікоў гаспадарак Іван Крупко абмеркаваў на відэаселектарнай нарадзе са старшынямі райвыканкамаў.

Як звярнуў увагу губернатар, найбольшы дэфіцыт кіруючых кадраў у рэгіёне назіраецца ў сельскагаспадарчай галіне. Праблема даўняя і характэрная не толькі для Гомельшчыны. Між тым новы пілотны праект у рэгіёне будзе развівацца ў межах «Школы маладога кіраўніка», якая рэалізоўваецца з 2018 года. Але сёлета работа з «рэзервістамі» набудзе новы фармат.

Для ўдзелу ў праекце амаль сто чалавек прайшлі сумоўе асабіста ў старшыні аблвыканкама. Адбыліся адборы з удзелам раённых кадравых службаў. У выніку ў праект з першага красавіка ўступяць 29 чалавек, якія адпраўляцца ў базавыя гаспадаркі вобласці.

Іван Крупко раённым уладам паставіў задачу падысці прынцыпова да падбору сельгасарганізацыі, куды накіруюцца менеджары АПК. Увага на бясстратную работу, рэнтабельнасць, эфектыўныя падыходы ў тэхналагічным працэсе і аўтарытэт кіраўніка гаспадаркі.

— Вы прымеце на работу кандыдата на пасаду намесніка кіраўніка прадпрыемства па вытворчасці для таго, каб ён мог адчуць усе працэсы і ў жывёлагадоўлі, у перыяд пасяўной, уборкі ўраджаю, нарыхтоўкі кармоў, — адзначыў Іван Крупко.

Губернатар таксама акцэнтуе ўвагу на індывідуальным падыходзе да кожнага ўдзельніка праекта — даць магчымасць рэалізаваць свае навыкі і здаровыя амбіцыі. Паводле ацэнкі Івана Крупко, пераважная большасць удзельнікаў праекта да канца года зможа ўпэўнена ўзначаліць любы сельскагаспадарчы калектыў:

— А мы ў сваю чаргу павінны падрыхтаваць для іх прадпрыемствы, куды яны заступяць на працу на пасадзе кіраўніка ўжо сёлета, — падкрэсліў Іван Крупко.

Кіраўнік рэгіёна асабліва зазначыў важнасць падобнага праекта для Гомельшчыны. Ініцыятыва дапаможа ўзмацніць сістэму эфектыўнага кіраўніцтва гаспадарак і забяспечыць бясстратную работу ўсіх сельгасарганізацый рэгіёна і, як вынік, высокую заработную плату і дастойнае жыццё людзей.

Як было вызначана, удзельнікаў праекта на пасаду намесніка кіраўніка гаспадаркі пры неабходнасці захаваць месца працы ў ранейшага наймальніка аформяць часовым пераводам. На новым месцы рэзервістам гарантуюць дастойныя заробак і ўмовы пражывання.

Дарэчы, сярод удзельнікаў праекта не толькі маладыя людзі, але і спецыялісты ва ўзросце за 40 гадоў. Усім належыць набірацца вопыту ў моцных лідараў, вучыцца, як ставіць задачы і, што яшчэ важней, кантраляваць іх выкананне. Па словах губернатара, такое настаўніцтва дапаможа ўдзельнікам праекта самім у будучыні адбыцца як кіраўнікам. Штомесяц рэзервісты будуць здаваць тэарэтычныя і практычныя экзамены.

Іван Крупко запэўніў, што зноўдзе час асабіста наведаць усе базавыя прадпрыемствы, куды накіруюцца менеджары АПК, — паназірае за іх работай, даведаецца, як ідзе іх падрыхтоўка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне начальніку аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Сазону Віктару Фёдаравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Сацыяльны вектар

ПЛАНЫ НЕ ЗМЯНІЛІСЯ

Новыя паліклінікі і школы будуць здадзены ў эксплуатацыю строга па графіку

Нягледзячы на складаную санкцыйную абстаноўку ў нашай краіне, уладамі па-ранейшаму максімальная ўвага аддаецца будаўніцтву сацыяльна важных аб'ектаў. Як адзначыў на прэс-канферэнцыі ў прэс-цэнтры БелТА начальнік аддзела будаўніцтва камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Павел ГОЛІК, усяго сёлета будзе выдзелена 129 мільёнаў рублёў на будаўніцтва, капітальны і бягучы рамонт аб'ектаў аховы здароўя сталіцы. Спікер заўважыў, што сёлета мэтаяй на гэты кірунак выдзяляецца нават больш сродкаў, чым у папярэднія гады. Цікава, якія сёння планы па будаўніцтве і рэканструкцыі паліклінік і бальніц у Мінску?

Фота БелТА.

Новая дзіцячая паліклініка адкрылася ў Жодзіне.

Сёлета ў сталіцы ў адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай ідзе работа па 16 аб'ектах аховы здароўя. «Роўна палова — восем аб'ектаў — знаходзяцца ўжо ў стадыі будаўніцтва, а другая палова праектуецца», — сказаў Павел Голік.

У сакавіку-красавіку гэтага года плануецца ўвесці ў эксплуатацыю шасціпавярховы новы будынак 9-й гарадской дзіцячай паліклінікі па вуліцы Даўгабродскай. У чэрвені будзе дабудаваны сяміпавярховы будынак дзіцячай паліклінікі ў мікрараёне Сухарава. У планах на другі квартал узвесці будынак 15-й гарадской паліклінікі па вуліцы Розы Люксембург. А да канца года ў мікрараёне Сокал плануецца будаўніцтва амбулаторыі ў жылым доме.

Таксама на чацвёрты квартал гэтага года запланаваны ўвод у эксплуатацыю (трэцяя чарга будаўніцтва) асобнага неўралагічнага корпуса 5-й гарадской клінічнай бальніцы. У Мінскім навукова-практычным цэнтры хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі пабудуюць блок трансплантацыі касцявога мозгу і ствалавых клетак.

Сёлета таксама плануецца выканаць першую з чатырох чэргаў капітальнага рамонту 36-й гарадской паліклінікі. Рамонт установы ідзе без адсялення, таму гэта асаблівыя ўмовы работы для будаўнікоў. Таксама плануецца ўвесці шэраг іншых аб'ектаў пасля капрамонту: падстанцыю хуткай дапамогі, 19-ю дзіцячую паліклініку, 1-ю дзіцячую паліклініку. Ужо ўведзена ў эксплуатацыю 16-я паліклініка.

На стадыі праектавання ў Мінску сёння знаходзяцца восем буйных аб'ектаў аховы здароўя, гэта:

1) новая дзіцячая паліклініка на 480 наведванняў у змену ў Лошыцы-9, на скрыжаванні вуліц Лучыны і Турава;

2, 3) дзве паліклінікі ў жыллёвым комплексе «Мінск-Свет»: дзіцячая на 680 наведванняў у змену і дарослая на 850 наведванняў;

4) шматпрофільная паліклініка ў пасёлку Усходнім на 850 наведванняў;

5) траўматалагічны корпус з прыёмна-дыягнастычным аддзяленнем у 6-й гарадской клінічнай бальніцы;

6) новы корпус дзіцячай інфекцыйнай бальніцы;

7) рэканструкцыя 13-й гарадской паліклінікі;

8) інтэрнат для медыкаў на вуліцы Каржанеўскага, які складаецца з двух карпусоў.

«І яшчэ, ва ўмовах пандэміі COVID-19 у дзевяці ўстановах аховы здароўя ў стацыянарах праводзіцца мадэрнізацыя сістэм медыцынскага газазабеспячэння», — дадаў начальнік аддзела.

Адукацыйная ўстанова адкрыецца да пачатку навучальнага года

Сёлета на будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў адукацыі інвестыцыйнай праграмай Мінска прадугледжана крыху больш за 89 мільёнаў рублёў. І гэта таксама досыць буйныя інвестыцыі. Самымі знакавымі аб'ектамі стануць прасторная школа на 1020 месцаў і дашкольная ўстанова на 230 месцаў. Абодва аб'екты размешчаны ў адным месцы — у шматфункцыянальным комплексе «Мінск-Свет», паведаміў **кіраўнік Цэнтра па забеспячэнні дзейнасці камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама і падпарадкаваных арганізацый» Глеб ЛАЎРЫНОВІЧ.**

Увод у эксплуатацыю ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі плануецца да пачатку навучальнага года, а дзіцячага садка — увосень. Акрамя таго, у цяперашні момант выконваецца рэканструкцыя ўстановы дашкольнай адукацыі на 130 месцаў у Партызанскім раёне, расказаў Глеб Лаўрыновіч. Таксама сёлета плануецца рэканструкцыя стадыёнаў у школах № 162, 147, 4, 196, 35 і 87.

Ён падкрэсліў, што ў сталіцы ўдзяляецца вялікая ўвага падтрыманню ў належным стане ўстаноў адукацыі. Сёлета выдзелена каля 38 мільёнаў рублёў на капрамонты. Усяго сёлета прадугледжаны капітальны рамонт на 34 аб'ектах.

На «Трактары» — пяць футбольных палёў

Гэта самы грандыёзны праект у планах па будаўніцтве і рэканструкцыі спартыўных аб'ектаў у сталіцы, лічыць **кіраўнік Цэнтра па забеспячэнні дзейнасці галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Аляксандр ФЕДАРОВІЧ.**

Такім чынам, на стадыёне «Трактар» будзе праведзена глабальная рэканструкцыя, пасля якой запрацуюць пяць футбольных палёў — адно для спаборніцтваў і чатыры трэніровачныя.

«Сёння ў Мінску ідзе работа па будаўніцтве і рэканструкцыі сацыяльна значных аб'ектаў у галіне спорту. Сярод іх тэнісныя корты па вуліцы Жудро. Акрамя таго, будзе праведзены капітальны рамонт у Мінскай гарадской СДЮШАР прафсаюзаў па спартыўнай гімнастыцы «Кольцы славы» на вуліцы Ванеева», — паведаміў Аляксандр Федаровіч.

Таксама пабудуюць два аб'екты з тэхніка-эканамічнай дапамогай Кітая. Гэта басейн міжнароднага стандарту па вуліцы Кальварыйскай і нацыянальны футбольны стадыён у раёне Партызанскага праспекта і вуліцы Ванеева. Акрамя таго, на сёлета ў сталіцы запланаваны рамонт 29 дваровых спартыўных пляцовак.

Станцыі пералівання крыві ў Барысаве і школа ў Смалявічах

Начальнік аддзела жылля і інжынернай інфраструктуры камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Яўген ТАТАРЫНАЎ расказаў, якія сацыяльныя аб'екты ў Мінскай вобласці плануецца ўвесці ў хуткім часе. З іх — некалькі аб'ектаў аховы здароўя, сярод якіх будынак паліклінічнага корпуса Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы, паліклініка ў аграгарадку Азярцо (Мінскі раён). У планах і рэканструкцыя корпуса рэабілітацыі клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці з разгортваннем аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі для нованароджаных. Таксама запланаваны ўвод адной з чэргаў будаўніцтва дзіцячага шматпрофільнага корпуса станцыі пералівання крыві і рэканструкцыя хірургічнага корпуса ў Барысаве.

Не забываюць у сталічным рэгіёне і пра аб'екты адукацыі і спорту. Так, у першым паўгоддзі будуць уведзены дзіцячыя садкі ў Любані і Фаніпалі. Увосень адкрыецца школа ў Смалявічах. У Маладзечне рэканструююць фізкультурна-аздараўленчы комплекс. У Старых Дарогах адкрыюць новую спартыўную залу.

Будзе весціся рэканструкцыя аб'ектаў сацыяльнай накіраванасці і ў Стоўбцах. Там абновяць кінатэатр «Беларусь» і псіханеўралагічны дом-інтэрнат. Таксама ў гэтым горадзе правядуць рэканструкцыю будынка былой казармы пад дзіцячую школу мастацтваў.

Сяргей КУРКАЧ.

Мікалай ЧАРГІНЕЦ:

«КУЛЬТУРА ЗАЎСЁДЫ СУПРАЦЬСТАІЦЬ ЗЛУ»

Напярэдадні з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі, які будзе прымеркаваны да Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу, «Звязда» сустрэлася з кіраўніком пісьменніцкай арганізацыі краіны Мікалаем ЧАРГІНЦОМ. Тэма размовы: якая роля літаратуры і пісьменніка ў часы выпрабаванняў як для ўсяго свету, цэлай краіны, так і для асобнага чалавека.



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

— Які сімвал веры Мікалая Чаргінца ў гэтыя няпростыя дні?

— Вера Чаргінца, па-мойму, ніколі не хісталася. Я пражыў немалое жыццё. Дзіцем быў у нямецкай акупацыі, бацька прыйшоў з вайны бязногім і пабудаваў дом. Мы бачылі, як падымаецца краіна, як вера народа ў сваё кіраўніцтва дазволіла стварыць магутную дзяржаву. Я служыў у міліцыі, тры гады аддаў Афганістану, быў паранены. Дванаццаць гадоў адпрацаваў у верхняй палаце беларускага парламента, узначальваў Пастаянную камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Адзінацаць гадоў прадстаўляў Беларусь у ААН, штогод па некалькі разоў выступаў на Генеральнай Асамблеі, адстойваў інтарэсы сваёй краіны, якія цалкам супадаюць з маімі.

Акрамя таго, доўгі час я жыву ў пісьменніцкім асяроддзі. Пісьменніцкае асяроддзе — гэта зрэз грамадства, увесь спектр меркаванняў. Мне як старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі трэба вывяраць лінію гэтай грамадскай арганізацыі, вытрымліваць яе, для гэтага часам прыходзіцца прыкладаць і асаблівыя намаганні. Гэта непазбежна, бо пісьменнікі, як і грамадскія дзеячы, не адседжваюцца ў баку, яны жыва адгукаюцца на тыя або іншыя падзеі.

Напрыклад, той жа 2020 год. Я вельмі ганаруся, што наша пісьменніцкая арганізацыя, бадай, адзіная грамадская, выразна заняла пазіцыю асуджэння спроб рэвалюцыі, звяржэння кіраўніцтва і ўкідвання дзяржавы ў вакханалію. Мы занялі дакладную пазіцыю.

Калі наступіў перыяд падрыхтоўкі перамен, у прыватнасці, унясення навацый у Канстытуцыю, мы ўсе ўважліва аднеслісе да прапаноў і Прэзідэнта, і іншых службовых асоб, і апазіцыі, і падтрымалі новы праект Асноўнага Закона. Упэўнены, што і падчас Усебеларускага народнага сходу члены Саюза пісьменнікаў Беларусі возьмуць актыўны ўдзел у вырашэнні пытанняў, якія будуць там падымацца.

У народзе кажуць, што стары вол ніколі баразны не скрывіць. Вось і мне ўжо не даводзіцца збочваць са свайго шляху, думаць пра нейкія ваганні. У мяне ў крыві, у генах, што дасталіся ад бацькоў, — служэнне дзяржаве, народу, садзейнічанне кіраўніцтву краіны ў вырашэнні задач, якія датычацца дабрабыту людзей, палітычнага курсу, нацыянальнай бяспекі. Я заўсёды буду трымацца такой пазіцыі. Гэта і ёсць мой сімвал веры, маё крэда.

— Мікалай Іванавіч, вы — дзіця вайны, пасля якой быў створаны вялізны пласт міралюбівай культуры і літаратуры. Тым не менш, ні свет, ні Еўропа, ні постсавецкая прастора не змаглі пазбегнуць ваенных канфліктаў. Чаму ў справе міру культура і літаратура аказваюцца бяссільнымі?

— Вы нагадалі мне вядомы афарызм Фёдара Дастаеўскага пра тое, што прыгажосць выратуе свет. Шмат хто спадзяецца на тое, што адукацыя, культура, прыгажосць здольныя папярэдзваць катастрофы, аўтарамі якіх з'яўляюцца людзі, або своечасова спыняць іх. Але свет занадта складаны, яго раздзіраюць жарсці, розныя думкі і супрацьлеглыя жаданні. Нярэдка тыя, хто прагне ўлады, не лічацца з чаканнямі свайго народа. І гэта, на жаль, прыводзіць да разладу, у тым ліку міжнароднага.

Драпежніцкія адносіны моцных гэтага свету да небагатых краін той жа Афрыкі, Азіі прывялі да вялізнага расслаення, глабальнай міграцыі. Заходняя Еўропа і Злучаныя Штаты Амерыкі прыклалі шмат намаганняў, каб пэўныя народы збяднелі.

Да таго ж у свеце з'явілася пэўная кагорта лідараў, якія лічаць, што яны могуць кіраваць усімі. І яны не лічацца з культурай. Мы ўвесь час кажам пра шматвектарнасць, павагу адзін да аднаго, пра баланс сіл і гарантыю міру. Але пасля распаду Савецкага Саюза з'явілася катэгорыя людзей, якія вырашылі, што маюць права дыктаваць астатнім, як ім жыць.

Паглядзіце, за што забілі прэзідэнта Ірака Садама Хусейна? Галоўная прычына — ён не падабаўся лідару Злучаных Штатаў Амерыкі. Пры гэтым забілі сотні тысяч іракцаў, знішчылі дзясяткі помнікаў чалавечай цывілізацыі, разбурылі краіну і дэстабілізавалі рэгіён.

Успомніце кіраўніка Лівіі Муамара Кадафі. Я аб'ездзіў не менш за сто краін і сам бачыў, што ў Лівіі жыхары Афрыкі бачылі краіну камунізму. Бензін там быў амаль бясплатны, маладым сем'ям дзяржава выдавала некалькі дзясяткаў тысяч долараў на куплю кватэры, адукацыя і медыцына бясплатныя. Але на гэты раз Кадафі не спадабаўся лідару Францыі, які помсціў за выдаванне інфармацыі пра спансіраванне яго перадвыбарнай кампаніі. Цана гэтай помсты — збядненне цэлага народа, разбурэнне краіны, гібель вялікай колькасці людзей. У народаў Афрыкі Лівія дагэтуль выклікае пачуццё павагі, хоць дзяржавы там ужо і няма.

Упэўнены, калі спытаць сусветных лідараў, што пасеялі разлад у тых або іншых рэгіёнах планеты дзеля сваёй нажывы, якія кнігі яны чыталі, то яны не знойдуць, што адказаць. Літаратура выконвае важную ролю ў развіцці чалавечай цывілізацыі, без яе немагчыма пабудаваць моцную дзяржаву. І сёння важна, каб ідэалогія суверэннай і незалежнай Беларусі сілкавалася ўласнай сучаснай літаратурай. Думаю, культурна-асветніцкі блок нашай дзяржавы трэба ўзмацніць ідэалагамі высокага класа — людзьмі, якія чытаюць кнігі.

— Саюз пісьменнікаў Беларусі аб'ядноўвае людзей, якія гэтыя кнігі пішуць...

— Наш творчы саюз некаторыя папракаюць тым, што ў ім мала маладых пісьменнікаў. Гэта блюзнерства. Тыя, хто чытае кнігі, ведае, што сур'ёзныя літаратурныя творы нараджаюцца дзякуючы чалавечаму досведу, а значыць — узросту. У маладосці становяцца паэтамі, а раманістамі — пасля 40-50 гадоў. Наш прафесар Уладзімір Гніламёдаў ва ўзросце 70 гадоў напісаў цудоўны раман «Расія».

Мы клапоцімся пра маладых. Нашы пісьменнікі ўзначальваюць больш за 200 літаратурных гурткоў па краіне, дзе вышукваюць таленты. Знаходзяць шмат, але большасць паэтаў падобная на звышновыя зоркі — хутка згараюць. Іншыя працягваюць свой шлях. Для вялікіх твораў у прозе, як правіла, патрэбны багаты жыццёвы багаж.

У нашым саюзе добрае спалучэнне моладзі і сталых пісьменнікаў. Штогод мы выдаём да 400 кніг. Каля паўсотні з іх можна назваць выдатнымі, астатнія — добрыя. Яны не вучаць людзей злу. Яны вучаць дабру. І што дрэннага ў тым, што жыхар сельскай мясцовасці становіцца членам нашага саюза, калі выходзіць на пенсію і піша некалькі кніг пра сваю малую радзіму? Яго з задавальненнем чытаюць жыхары гэтай мясцовасці, яны пазнаюць сябе ў яго творах. У людзей нараджаецца гонар за свой край, пачуццё ўласнай годнасці. І мясцовыя ідэолагі павінны гэта разумець і падтрымліваць. Пісьменніка трэба адэньваць не па стажы і не па ўзросце, а па галаве, па яго розуме.

Я задаволены, што ў час няпростых выпрабаванняў двух апошніх гадоў наша пісьменніцкая арганізацыя не пахіснулася. Выступілі адзіным фронтам. Мы, дарэчы, выступаем перад людзьмі на год да 20 тысяч разоў. Праўда, і паплаціліся: больш за 300 нашых членаў перахварэла на каранавірус, бо былі ў гушчы народу, больш за 50 чалавек памерла. Яны адстойвалі інтарэсы дзяржавы. І калі нехта кажа пра недахоп палітычнай актыўнасці ў Саюзе пісьменнікаў — гэта кашчунства.

Па нашай просьбе Адміністрацыя Прэзідэнта даручыла правесці даследаванне на прадмет запатрабаванасці кніг вядомых беларускіх аўтараў у бібліятэках. Аказалася, што на год не менш за два з паловай мільёна чалавек чытае такія кнігі. Хіба гэта дрэнна?

Калі вярнуцца да работы з моладдзю, то трэба сказаць і пра работу нашага тэатра, а гэта 22-23 спектаклі на месяц, і кожны збірае каля 400 гледачоў. Гэта і ёсць асветніцкая, культурная і ідэалагічная работа.

Мінск, дарэчы, адзіны горад у свеце, які займеў Парк пісьменнікаў. Ён у раёне Нацыянальнай бібліятэкі. Гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы гарадскіх уладаў. Мы там ужо тройчы саджалі дрэвы. Але хочацца, каб гэтае месца стала культурным цэнтрам, і для гэтага нам патрэбная дапамога.

Помню часы, калі ў сталічным Парку імя Горкага гучаў аркестр. Вось і ў Парку пісьменнікаў павінны гучаць музыка, выступаць паэты, аўтары дзіцячых кніг, адбывацца творчыя сустрэчы, літаратурныя дыспуты, конкурсы, сустрэчы пакаленняў. Але Саюз пісьменнікаў — грамадская арганізацыя, у нас няма ўласных сродкаў. Культуру заўсёды падтрымлівае дзяржава. У нас шмат добрых таму прыкладаў, але на падобныя моманты патрэбная асаблівая ўвага. Бо гэта ўжо пра данясенне культуры ў масы. Мы гатовыя бясплатна выступаць і сустракацца з людзьмі, нам для гэтага патрэбныя толькі невялікая сцэна і мікрафон, а дзецям, якія будуць нас слухаць, патрэбнае яшчэ і марожанае.

Каласальную работу праводзяць і рэгіянальныя аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Напрыклад, Гомельская арганізацыя ладзіць мерапрыемствы міжнароднага фармату: конкурсы, сустрэчы. Праз гэта аддзяленне прайшло за апошнія гады каля 200 маладых пісьменнікаў і паэтаў. Там друкуецца шмат кніг, выходзіць альманах для дзяцей.

Пісьменнікі робяць нямала. Бяда ў тым, што сярод чыноўнікаў недастаткова тых, хто чытае кнігі, паважае літаратуру. Якраз такія і крытыкуюць нас.

Яшчэ адзін папрок у наш адрас: маўляў, пісьменнікі не нясуць свае сцэнарыі ў кінастудыю. Пісьменнік не павінен несці свой твор рэжысёру. І дырэктар кінастудыі са мной згодны. Рэжысёр павінен чытаць кнігі, і калі ўбачыць нешта прыдатнае для будучага фільма, ён ідзе да аўтара. Да мяне прыехалі з Санкт-Пецярбурга і прапанавалі купіць мае кнігі для серыяла ў 200 эпізодаў. Сёлета і ў Беларусі запланаваны здымкі фільма па маёй кнізе «Аперацыя «Кроў». І ў іншых пісьменнікаў Беларусі нямала твораў, па якіх можна здымаць добрыя фільмы.

Мы ўвесь час думаем і пра новыя формы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй. Запрашаю чытачоў «Звязды» ў Салон кнігі, які мы адкрыем 22 сакавіка на вуліцы Кісялёва ў Мінску. Выдавецтва «Харвест» ахвяравала нам вялікую кватэру на першым паверсе, мы атрымалі дазвол стварыць там клуб.

Ідэя наступная. У нас многія аўтары не могуць выдавацца ў дзяржаўных выдавецтвах. А прыватныя плацяць ім кнігамі. Яны імкнуцца гэтыя кнігі прадаць. Але дзяржаўны магазін возьме сабе ад 40 да 60 працэнтаў ад выручанай сумы. У кніжным салоне за такую магчымасць возьмуць 10-15 працэнтаў. Гэта ўжо добра. Да таго ж там можна будзе асабіста з пісьменнікам сустрэцца, пагутарыць пра кнігу, атрымаць аўтограф, задаць пытанні. Нарэшце, выпіць кавы або чаю. Гэта і пляцоўка для сустрэч творчых асоб, абмеркавання літаратурных навінак. Думаю, добры прыклад для пераймання, варта стварыць падобнае ў кожнай вобласці.

Культура заўсёды супрацьстаіць злу. Але ёй трэба дапамагаць.

— На ваш погляд, падчас вострых канфліктаў літаратура павінна займаць пазіцыю міратворцы альбо аднаго з бакоў?

— Яна павінна быць на баку дабра і праўды. І змагацца за іх. Не заўсёды пазіцыя міратворцы дарэчная. Важна сродкамі мастацтва і мастацкага слова паказаць, чаму зло — гэта дрэнна. Пазіцыя літаратуры не павінна быць згодніцкай заўсёды. Маўляў, вы кепскія, а вы добрыя, але давайце я вас памірю. Гэта няправільна, бо тады зло застанецца злом і будзе шкодзіць дабру. Толькі спачатку трэба адрозніць дабро ад зла.

Пісьменнік павінен разумець, што такое сапраўднае дабро, а што толькі носіць яго маску, ды насамрэч — падробка дзеля асабістай карысці, жадання спадабацца, унутры ж не мае нічога вартага. Паняцце дабра нярэдка скажаецца. Літаратура павінна бачыць гэта і паказваць праўду. Яна павінна дапамагаць людзям разглядзець свае памылкі, падштурхоўваць іх да жадання стаць лепшымі. Неяк журналісты папракнулі Уінстана Чэрчыля тым, што ён па адным і тым жа прадмеце спачатку выказваў адно меркаванне, а потым яго змяніў. І ён адказаў ім, што не бачыць нічога кепскага ў здольнасці чалавека ўдасканальвацца.

Пісьменнік таксама павінен увесь час удасканальвацца, валодаць як мага больш поўнай інфармацыяй, унікаць ва ўсё новае. Ён можа з нечым не пагаджацца, але калі сутыкнецца з барацьбой зла і дабра, абавязаны разабрацца, што адбываецца, і паказаць гэта людзям. І прымірыць тут бакі канфлікту не заўсёды атрымаецца. Аднак можна параіць злу перайсці на бок дабра.

— Ці будуць адлюстраваныя на з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі падзеі апошняга часу?

— Вядома. З'езд падвядзе вынікі работы за пяць апошніх гадоў. Мы будзем абмяркоўваць ролю пісьменніка ў той сітуацыі, якая сёння склалася ў свеце і грамадстве. Будзем казаць пра пісьменніка не толькі як пра аўтара твораў, але і як пра грамадскага дзеяча, фігуру, якую ведае народ, да думкі якога прыслухоўваюцца. Будзем казаць пра тое, у чым недапрацоўваюць пісьменнікі.

Я б хацеў сказаць ім: не спяшайцеся з высновамі. Пісьменнік — не журналіст, ён не абавязаны гнацца за аператыўнасцю. Ён павінен разважаць і не паддавацца эмоцыям, абавязаны больш ведаць, чым абывацель, журналіст і любы іншы дзеяч культуры. Сам павінен шмат чытаць, разбірацца і ў палітыцы, і ў эканоміцы, і ў праблемных пытаннях грамадства. Ад яго чакаюць глыбіні думкі, здольнасці прадбачыць будучае і дапамогі. Асабліва патрэбная дапамога чалавеку, які знаходзіцца ў складаным стане, у пошуку правільнага выхаду, адказаў на важныя пытанні. Пра такую ролю пісьменніка мы, па магчымасці, пагаворым на з'ездзе.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«НЯДОЎГІ ВЕК. І ТОЙ ПРАЖЫЦЬ НЕ ЎМЕЕМ: ТО КРЫЎДА РАЗ'ЯДНАЕ, ТО МАНА...»

Да прыяцелькі не дазваніцца было — і 20 хвілін, і 40... Праз гадзіну хіба прабіліся. Першае, што спыталі: «З кім вы так доўга?» — «Ды з сястрой, — прызналася жанчына, — з Наташай». — «Дык яна ж праз хату жыве?» — «Ага... Блізенька... Раней, да вось гэтай кароны, мы з ёй па два разы на дзень недзе сыдземся — ці ў мяне, ці ў яе — пасядзім, пагаворым. А цяпер во — толькі па мабільных... Прывыклі. Файная, скажу вам, рэч! З ёй цяпер нават зручней: ні мне апранацца, каб да сястры схадзіць, ні ёй частаваць». Мяняюцца часы... І як жа істотна (ледзь не з ног на галаву) мяняюць зносіны.

Не пра стол

Госці даўно не збіраліся, а тут (страшнаватае слова — нарэшце...) мы дачакаліся: будуць! Загадзя падрыхтаваліся, накрылі сталы.

А перад гэтым у шафе, сярод іншага дабра, адкапалі аж чатыры вялікія прыгожыя абрусы. Заслалі адзін — хапіла. Тры іншыя — калі б маглі — закрыўдавалі б, бо, мяркуючы па ўсім, не хутка нам іх даставаць, не хутка зноўку прымаць гасцей за святочным сталом.

Дзіва

Сяброўка песціць сваіх дамачадцаў: смачна гатуе (і, здаецца, усё), але «Напалеон»...

Гэта — яе любімы, фірменны торт. Сын яго змалку дзіўным заве, бо казаў, пачынаеш есці, — ён такі вялікі, а потым (галоўнае — неяк адразу) малы... І няма. Парадокс.

Дарослыя — не дзеці

Сярод настаўнікаў мужчын цяпер мала: раз-два і аблічыўся, як той казаў.

Гэты — мусіць, нядаўна працуе: стараецца, розныя мерапрыемствы для вучняў ладзіць, пра самыя цікавыя піша ў газету.

...У той раз артыкул быў пра экскурсію, пра тое, як на зваротным шляху іх аўтобус (усё па плане) збочыў на аграсядзібу і ўжо там, вучням — цытата — «у інтэрактыўнай форме былі дазволены пэўныя дзеянні па доглядзе коней».

Прачытаўшы і, мякка кажучы, не ўсё зразумеўшы, муселa спытаць, «што б гэта значыла?». Настаўнік з ахвотай растлумачыў, што гаспадары той аграсядзібы дазволілі юным гараджанам падыйсці да сваіх вараных ды рыжых, зблізку паглядзець ды пагладзіць, нечым з рукі пачаставаць, а самым ахвотным — яшчэ і конна праехаць. «Дык, можа, так і напісаць?», — спытала ў аўтара. — «Для дзяцей — можна было б, — згадзіўся настаўнік. — А для калег і начальства — лепей вось так. Яны зразумеюць».

...І адно не мёд, і другое не рэдзька?

За што змагаўся

Гэтыя два дзяды сябруюць з інстытута: часцяком тэлефануюць адзін аднаму, праз месяц-другі сустракаюцца. Найчасцей — не дома, на нейкай нейтральнай тэрыторыі: у цэнтры горада кафэ аблюбавалі. Расказвалі, што і гатуюць там вельмі добра, і цэны ў абед прымальныя, і абслуга як мае быць: маладыя-прыгожыя хлопцы, дзяўчаты ўсё прынясуць, пададуць, потым — прымуць, спытаюць: можа, нешта яшчэ?.. А ты сядзі сабе — еш, пакрысе выпівай, размаўляй...

Пятровіч тады «адрываецца» — не змаўкае, можна сказаць, бо дома пагаварыць няма з кім. Была калісьці жонка, быў сын — нармальна жылі як быццам, пакуль да яго, як казаў, «не падкацілася» іншая (развядзёнка, з дзіцем) — прыгожая і такая ўжо закаханая...

Нехта, можа, і не паддаўся б — не адказаў тым жа — Пятровіч не змог: паспадзяваўся, што гэты, з дазволу, маленькі раман (на вялікі ён «не падпісваўся») як пачаўся, так і скончыцца — сям'я нічога ведаць не будзе. А выйшла ўсё наадварот... Прычым, нейкі час — як чалавеку здавалася — нават добра (выйшла): старая жонка з дому адправіла (каб не казаць «выгнала»), маладая ў сябе прыняла — прычым з такімі абдымкамі...

Пятровіч, можна сказаць, шчаслівы быў — пакуль працаваў (гэта ён цяпер на пенсію выйшаў), пакуль дастойна забяспечваў, пакуль для новай сям'і будаваў кватэру і — галоўнае — пакуль не хварэў, а потым...

Нехта праўду сказаў, што па вушы можна не толькі ўлюбіцца, але і ўляпацца: у Пятровіча пасля другога разводу засталіся пакой у камунальнай кватэры, букет хвароб, сабака і, дзякаваць богу, сябар, з якім можна пагаварыць.

Розум прыходзе па шкодзе

...Ад сына — і за вярсту, можна сказаць — несла тытунём.

Бацька, унюхаўшы, стаў расшпільваць дзягу. Маці, шкадуючы дзіця (12 гадоў, але ж адно... І такое позняе), заступіла яго сабой, стала казаць, што Косцік не вінаваты, што гэта ўсё вуліца, благая кампанія... А ён зусім не з такіх: ён болей не будзе... А калі і так — у крайнім выпадку — то з цыгарэтамі (ты ж паглядзі!) ледзь не ўсе цяпер — і ў тэлевізары, і ў вёсцы ў іх... Смаляць і нядрэнна выглядаюць — жывуць.

...Жыў і гэты сынок-пестунок: з гадамі ўсё часцей і часцей, цяжэй і цяжэй хварэў, на інваліднасць выйшаў, аднак курыць (і выпіваць) не кідаў — нават з астмай... Да якой у лютым «прычапіўся» каранавірус, і на гэты раз маці — як ні старалася — ні заступіць, ні засланіць яго не змагла: ён, малады, з зямелькай пабраўся, яна — старэнькая і зусім адна — засталася.

Шкадуе цяпер, што не так выхоўвала, што замнога песціла ды гладзіла па галоўцы, што ніколі не накрычала (і мужу не дазволіла), не зберагла...

«Урок моваznаўства»: прыказкі, прымаўкі ды іншыя моўныя залацінкі з адной мовы на другую не перакладаюцца — шукаецца адпаведнік. Такім чынам рускаму «Крепок задним умом» адпавядае наша «Розум прыходзе па шкодзе».

Як паглядзець...

Эканомілі: пад будаўніцтва лецішчаў выдзялялі па чатыры-пяць «сотак» зямлі. Там табе і сад, і город, і ўсе пабудовы... «Мала», — скардзіўся адзін мужчына другому. — «Не пражывай, — суцяшаў яго той, — зараз па тры-чатыры соткі накацім, і стане болей».

На лецішчы ў знаёмых і сапраўды дзесяць. «Летам касьба дастае», — скардзіўся гаспадар, аж пакуль на ўчастку не насадзіў кустоў ажын ды малін, парэчак, агрэсту, пакуль там жа не разрасліся лапушыстыя хосты.

Што здзіўляе, цвітуць яны так сабе: можна сказаць, непрыгожа, а варта зрэзаць — паставіць у вазу... І летам вачэй не адвесці, і нават зімой.

Няма дурных?

...«От разумніца! От малайчына! — казаў (і кажа) дзядуля гэтай унучцы (іншых проста не мае) і заўсёды ў працяг дадае: — Вялікая расці!»

Дзяўчо, дзякуй богу, слухала яго і слухае — расце, хоць на выстаўку... Дастала вось з шафы асеннюю куртку, хацела апрануць, а яна замалая.

Бабуля (бацькі за мяжой) тры дні ў развагах была, бо добрая ж рэч! Выкінуць — проста грэх, аддаць — няма каму, як быццам? І грошы патрэбныя...

А таму (спроба ж не хвароба?) яна прызначыла цану — дала аб'яву, што прадасць...

Потым расказвала, што яе тавар — унучына амаль новае паліто — зацікавіў аж двух чалавек. Адзін удакладніў памеры і прапаў, другі — адразу ж сказаў, што забірае: высылайце, маўляў, паліто, і, каб грошы «скінуць», — рэквізіт сваёй плацежнай карткі.

— Ага, зараз жа! — сказала яму вось гэтая бабуля і, вядома ж, нічога не выслала...

А нехта — мог...

Як кажа наша сваячка: «Розум — не бровы... Яго недамалюеш, калі няма».

Тайна...

На ўлазіны да шэфа калектыў (прынамсі, яго жаночая большасць) збіраўся без ахвоты — жаба душыла (тым больш — незамужніх), бо ён — пры сваёй пасадзе, знешнасці і як быццам цвярозым розуме, ажаніўся зусім па-дурному: на свае вочы бачылі, з нейкай — малой, даўганосай, лупатай, дзяцей з ёй прыжыў і разводзіцца — нават не думае. Ва ўсякім разе — іншых жанчын ну зусім не бачыць! Кватэру вось атрымаў — у новым доме, палепшанай планіроўкі... «Зойдзем, павіншуем, паглядзім, што там як, — дамаўляліся зайздросніцы, — і адразу ж сыдзем».

Вырашыць так было прасцей, зрабіць — не атрымалася, бо яшчэ ў вітальні кожнаму з гасцей прапанавалі па фужэры шампанскага — запрасілі ў дом, дзе было столькі ўсяго — чароўных пахаў, карцін, дзіцячых малюнкаў і здымкаў, рыбак, вазонаў, кніг...

Разгледзець усё не дала гаспадыня — паклікала за стол, гэтак густа застаўлены

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

розных смакатой, што «аналітык» і той разгубіўся — забыў наліць...

Напоі на стале былі розныя, закускі смачныя, размовы лёгкія і цікавыя, а галоўнае...

— Мы заспяваем? — спытаў гаспадар у даўно не галодных гасцей, і яго жонка (жанчына як жанчына... Хто казаў, «непрыгожая»?) тут жа дастала акардэон.

Яны спявалі ўсе разам, потым гаспадары ўдваіх, гаспадыня адна (пад балконам стаў збірацца народ) і зноў усе разам... Найсмялейшыя з тымі ж песнямі пайшлі танцаваць — тут жа, у кватэры, потым, пад гукі вальса, перамясціліся на досыць прасторную пляцоўку каля смеццеправода, дзе да іх далучыліся суседзі...

Карацей — разышліся госці так, што... разысціся (у сэнсе расстацца) ну ніяк не маглі, хоць яно і трэба было...

Што цікава: па дарозе туды, на банкет да шэфа, хто-ніхто з яго супрацоўнікаў (а найбольш супрацоўніц) думаў: «Ну нічога ж на ёй... І як ён з такой ажаніўся?», па дарозе назад — «Ну нічога ж... на ім! А яна чамусьці пайшла».

Як той казаў, у небе і зямлі схавана больш, чым можа нам прысніцца...

Хто каго любіць...

...У тралейбусе гэтая сямейка разам ехала: дзеці на адным сядзенні, бацькі — на другім, але, відаць, пасварыўшыся, бо паводдаль і моўчкі, быццам чужыя.

Гэтак жа потым яны і выходзілі, стаялі на прыпынку, можна сказаць, адвярнуўшыся...

Адвярнуліся б, не пазіралі на іх і людзі, калі б не малыя — дзве аднолькава мілыя дзяўчынкі ў цёмных штоніках, чырвоных куртачках і белых шапачках. Двайняткі — да бабкі не хадзі: адну з іх моцна трымаў за руку бацька, другую — маці.

А малыя, ну вядома ж, прывыклі быць разам. І таму цяпер, раз'яднаныя, нічога не разумелі — пакутліва пазіралі адна на адну, цягнуліся насустрач...

Быццам хацелі злучыць тое, што ніяк не павінна парвацца.

З агню ды ў полымя

Бяда па бядзе, як па нітачцы ідзе — гэта пра Алёну, сваячку з Украіны. Летась, 28 мая, у яе на руках памёр муж — у няпоўныя 50, нічым ні дня не хварэўшы...

Зноў жа летась, у жніўні, досыць цяжкую анкалагічную аперацыю перанёс бацька. А ў кастрычніку не стала маці — каранавірус, згарэла за дзевяць дзён...

Пасля ўсяго вось гэтага, невядома як перажытага, жанчыне, у якой два сыны (25 гадоў і 17), «не хапала» толькі таго, што сёння там робіцца.

Зая... Але не тая

Расказ гэты варта пачаць здалёк — з Заіпершай.

...Жанчынка адна позна вечарам тралейбус дагнала, тут жа дастала мабільнік, спытала: «Зая, ты дзе, ты дома?» і, падобна, пачула, што там — не толькі яна: усё сямейства ў зборы... Праўда, хлеба няма — ніякага. І кефіру трэба было б купіць. І піва Сержыку хочацца...

А таму на прыпынку ля крамы жанчына (дзве сумкі ў руках) выйшла, усё, што сказалі, пэўна ж, купіла і павалакла — туды, дзе Зая (трэба разумець, муж), дзе не маленькі ўжо Сержык (сынок ці зяць), дзе ўсе дома і яе чакаюць. А вось не шкадуе, не любіць ніхто.

...Абразок гэты настолькі спадабаўся адной з чытачак, што яна захацела пазваніць, каб тое сказаць.

Мне таксама ёй нешта трэба было... Праз нейкі час набрала «міжгорад» і, пачуўшы ў хаце галасы (жанчына жыве адна), стала выбачацца, бо перашкодзіла ж...

— Ды не, што вы?! Ніколечкі! — загучала ў адказ. — Гэта ж тэлевізар, Зая мая. Мы з ёй удзвюх жывём. І па-рознаму. Бывае, што добра: яна мне пра надвор'е ўсё раскажа, параіць нешта, песень напэе... А бывае, ну такую лухту вярэе, такую бязглуздзіцу, што свет не чуў! Усё, думаю, «развод», заўтра ж выкіну, каб і смароду ў хаце не было... А потым сяджу і сама сабе разважаю: гэта ж колькі гадоў мы разам пражылі! І без ніякіх клопатаў: есці яна не просіць, гарэлкі (нават кефіру) не п'е, не б'ецца... А розную лухту малоць пачне, за дурніцу трымаць — дык як яе ж і выключыць можна? Правільна я мяркую?

Хто б спрачаўся, як той казаў: вось гэткая Зая — не найгоршы варыянт.

Хоць, вядома ж, і не найлепшы.

Валянціна ДОЎНАР.

А вы ведалі?

Мікразяленіва: даніна модзе ці рэальная карысць?

У свеце з'явіўся новы трэнд у галіне здаровага харчавання — вырошчванне і ўжыванне ў ежу мікразяленіва. Галоўная яго добрая якасць — яно даступнае ў любую пару года.

ШТО ГЭТА?

Гэта маладыя парасткі агародніннych або каранеплодных, радзей травяністых культур. Вышыня іх не большая за 5-15 см, яны маюць мініяцюрныя сцяблінкі з семядолямі, а часам і пару першых сапраўдных лісцікаў. Ураджай збіраецца ў залежнасці ад сорту і віду расліны, але не пазней, чым праз 12 дзён пасля сяўбы.

У якасці мікразяленіва вырошчваюць як традыцыйнае зяленіва — салату, цыбулю, кроп, пятрушку, кінзу і іншыя вострыя травы, так і расліны, якія ў якасці зяленіва выкарыстоўваюцца рэдка — радыску, дайкон, буракі, або не выкарыстоўваюцца ў гэтай якасці наогул — амарант, сланечнік, нут, капусту, зялёную грэчку і іншыя.

У ЧЫМ КАРЫСЦЬ?

— У склад дадзенага суперфуду ўваходзяць вітаміны груп A, B, C, E, K, PP, мікра- і макраэлементы — магній, калій, кальцый, ёд, жалеза, фосфар, эфірныя алеі, раслінныя бялкі, флаваноіды, караціноіды, антыаксіданты, вялікая колькасць хларафілу, — пералічае ўрач-інтэрн аддзела гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Наталля Гурыновіч.

Дакладны склад мікразяленіва залежыць ад яго віду. Напрыклад, людзі з праблемамі страваванне могуць атрымліваць клятчатку з мікразяленіва, а не з сырой гародніны, больш складанай у перапрацоўванні. Крэс-салата спрыяе паляпшэнню зроку, брокалі выводзіць таксіны з арганізма, зяленіва грэчкі мае павышаную канцэнтрацыю руціну, які забяспечвае здароўе сардэчна-сасудзістай сістэмы, а маладое лісце радыскі павышае пругкасць скуры.

Такое зяленіва не апрацоўваюць тэрмічна: лічыцца, што пры награванні яно страчвае частку карысных уласцівасцяў. Часцей за ўсё яго ядуць сырым: дадаюць у салаты, супы, смузі, выкарыстоўваюць у якасці асноўнага гарніру да мяса і рыбы, ім дапаўняюць бутэрброды і закускі.

Асноўнае адрозненне мікразяленіва ад звычайнага — павышаная канцэнтрацыя вітамінаў і іншых нутрыентаў. Менавіта на ранняй стадыі развіцця маладыя парасткі ўтрымліваюць больш каштоўных пажыўных рэчываў, закладзеных у фазе фарміравання насення.

ЯК ВЫРАСЦІЦЬ?

Вырошчванне мікразяленіва — цікавы і займальны занятак, які не патрабуе шмат часу і істотных затрат. Усё, што трэба, — пачак спецыяльнага насення і пажыўны субстрат. У якасці субстрату можна выкарыстоўваць спецыяльныя дываны, намочаную вату, вільготныя папяровыя ручнікі, пілавінне або гідрагель. Грунт рэдка выкарыстоўваецца для вырошчвання такіх парасткаў, бо ён забруджвае іх і павялічвае рызыку размнажэння бактэрый.

Самы просты спосаб — прарошчванне на марлі: складзіце марлю ў некалькі пластоў, пакладзіце на дно талеркі і добра намачыце. Насенне змясціце ў шклянку з вадой і пакіньце на 3-5 хвілін. Затым размяркуйце вільготныя семечкі па марлі, накрыйце шкляным вечкам або поліэтыленавай плёнкай і змясціце на падаконніку. Увільгатняйце насенне раніцай і ўвечары пры дапамозе пульверызатара. Калі з'явяцца першыя парасткі, зніміце вечка ці плёнку і праз 10 дзён (у залежнасці ад віду мікразяленіва) зразайце сцяблінкі і атрымлівайце карысныя для вашага арганізма вітаміны і рэчывы!

Скажыце, доктар!..

ЦЫНК, ВІТАМІНЫ C і D

Што з іх сапраўды карысна пры лячэнні і аднаўленні пасля COVID-19

Ці мэтазгодна прымаць вітаміны C, D і цынк для прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі? Выказваюцца здагадкі, што ў вялікіх дозах яны здольныя аказваць станоўчы ўплыў на цячэнне і выхад хваробы. Першапачаткова навуковая медыцынская супольнасць лічыла COVID-19 вострай рэспіраторнай вірусная інфекцыяй. Толькі з часам прыйшло разуменне, што неабходныя зусім іншыя, чым пры ВРВІ, падыходы да фармакатэрапіі з ужываннем антыагрэнтаў, антыкаагулянтаў, імунасупрэсантаў і глюкакартыкоідаў. Ці ёсць месца для вітамінаў у гэтай, зусім іншай, чым ВРВІ, праблеме? Пра гэта мы гутарым з урачом агульнай практыкі 11-й сталічнай паліклінікі Вікторыяй ВІЛЮГІНАЙ.

— Вікторыя Валер'еўна, якія вітаміны адыгрываюць важную ролю ў лячэнні і аднаўленні пасля каранавіруснай інфекцыі?

— Вітаміны — гэта група біялагічна высокаактыўных арганічных рэчываў, пераважна раслінnага паходжання, якія аказваюць уплыў на працэсы метабалізму і нашы фізіялагічныя функцыі. Асноўнай крыніцай большасці вітамінаў для чалавека служаць прадукты харчавання. У адрозненне ад іншых харчовых рэчываў, сутачная патрэба чалавека ў розных вітамінах складае мізэрныя велічыні — ад дзясяткаў міліграмаў да іх тысячных доляў.

Для прафілактыкі і лячэння COVID-19 першапачаткова разглядалася актуальнасць ужывання вітамінаў C, D і мікраэлемента цынку.

«Інфармацыя аб шкодзе ці карысці метадаў лячэння абнаўляецца вельмі хутка, і трэба быць гатовымі да хуткай змены рэкамендацый і пратаколаў лячэння ад COVID-19».

— Чым выклікана цікавасць да цынку ў якасці сродку прафілактыкі і лячэння каранавіруснай інфекцыі?

— Ёсць некалькі меркаваных крытэрыяў. У пры-ватнасці, тое, што 118 цынкаўтрымлівальных бялкоў у арганізме чалавека маюць дачыненне да супрацьвіруснай абароны. З іх 11 бялкоў непасрэдна адносяцца да абароны ад РНК-вірусаў накшталт SARS-CoV-2 і тармажэння цітакінавага шторму. Акрамя таго, іоны цынку, магчыма, тармозяць рэплікацыю вірусаў у клетках.

Аднак за апошні год, калі прыкметна павялічылася колькасць даследаванняў у гэтай галіне, доказная медыцына не атрымала даных, якія адназначна б указвалі на рацыянальнасць прымянення цынку ў лячэнні і прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі. Такім чынам, пакуль няма навукова абгрунтаваных даных у падтрымку рэгулярнага прыёму цынку пацыентамі з COVID-19, а доказы карысці з'яўляюцца сумнеўнымі.

—Раскажыце пра вітамін C. Ці ёсць ад яго карысць пры COVID-19?

— Гэта водараствараль ны вітамін, які павінен паступаць у наш арганізм штодня з кожным прыёмам ежы. Сутачная патрэба дарослага чалавека складае прыкладна 90 мг вітаміну C.

Не рэкамендуецца перавышаць яго сутачную дозу больш чым у 1 г. А вось паступленне ў арганізм больш за 2 г у суткі можа выклікаць раздражненне ЖКТ, дыярэю.

Вітамін C неабходны для біясінтэзу калагену і жыццёва важны для падтрымання цэласнасці эпітэлію. Таксама адыгрывае важную ролю ў некаторых аспектах імунітэту, напрыклад, у міграцыі лейкацытаў да ўчасткаў інфекцыі, фагацытозе і знішчэнні бактэрый, прадукцыі антыцелаў.

Вітамін C адыгрывае, хутчэй за ўсё, вырашальную ролю ў апасродкаванай рэакцыі надныракавікаў на стрэс, асабліва пры сепсісе. Дарэчы, канцэнтрацыя вітаміну C

у надныракавіках у 3—10 разоў вышэйшая, чым у любым іншым органе.

Па звестках некаторых даследчыкаў, вітамін C павялічвае выпрацоўку картызолу надныракавікамі. Картызол жа, у сваю чаргу, аказвае стымуляцыйнае дзеянне, бадзёрыць пацыента, які апісвае свой стан як «палягчэла». Верагодна, аналагічны эфект мы можам атрымаць пры COVID-19, калі высокімі дозамі вітаміну C стымулюем выпрацоўку картызолу. Але гэта толькі магчымы механізм дзеяння.

Акрамя таго, нельга забываць, што пры доўгачасовым прызначэнні высокіх доз вітаміну C надныракавікі запавольваюць сваю актыўнасць, а выпрацоўка картызолу змяншаецца. Таму прыём высокіх доз больш за 10 дзён, відавочна, не з'яўляецца рацыянальным.

За мінулы год было апублікавана як мінімум 11 маштабных навуковых даследаванняў па вітаміне C пры лячэнні COVID-19. Нягледзячы на чаканыя эфекты, яркіх доказаў карысці вітаміну C пры лячэнні каранавіруснай інфекцыі пакуль не з'явілася. Аднак няма і доказаў шкоды. Таму, улічваючы магчымасць гіперпрадукцыі картызолу на фоне кароткатэрміновага прымянення высокіх доз вітаміну C, яго прызначэнне магчыма, калі ў пацыента няма супрацьпаказанняў з боку страўнікава-кішачнага тракту.

— Яшчэ адзін вітамін — D, таксама «засвяціўся» пры лячэнні каранавіруснай інфекцыі. Што кажуць даследчыкі наконт яго?

— Вітамін D сінтэзуецца пад дзеяннем ультрафіялетавых прамянёў у скуры, а таксама паступае ў арганізм чалавека з ежай. Узровень вітаміну D у арганізме можна вымераць, і яго параметры наступныя:

- ✓ выяўлены дэфіцыт (менш за 10 НГ/мл);
- ✓ дэфіцыт (менш за 20 НГ/мл);
- ✓ недастатковасць (21—30 НГ/мл);
- ✓ адэкватныя ўзроўні (больш за 30 НГ/мл).

Паколькі вітамін D тлушчараствараль ны і можа назапашвацца ў арганізме, высокія дозы (больш за 150 НГ/мл) могуць выклікаць выразныя таксічныя эфекты.

У выпадку лабараторна вызначанага на аснове аналізу крыві дэфіцыту вітаміну D (менш за 20 НГ/мл) неабходна прымаць прафілактычныя дозы прэпаратаў. На рынку прадстаўлены розныя формы. Маюцца тыя, што змяшчаюць сутачную дозу (як правіла, ад 500 МЕ да 2000 МЕ, у залежнасці ад узроўню дэфіцыту вітаміну D), яны прымяняюцца штодня. Таксама маюцца высокадозныя формы (50 000 МЕ) для штотыднёвага прымянення.

Асноўныя ўласцівасці вітаміну D — кантроль і ўдзел у абмене кальцыю ў арганізме. Вітамін D спрыяе яго ўсмоктванню са стрававальнага тракту, садзейнічае назапашванню ў касцях, перашкаджае рэзорбцыі касцяной тканкі. Апроч гэтага, вітамін D удзельнічае ў мноcтве іншых працэсаў у арганізме чалавека, у тым ліку ў рэгуляцыі імунных рэакцый.

«Доказная медыцына не атрымала даных, якія адназначна б указвалі на рацыянальнасць прымянення цынку ў лячэнні і прафілактыцы каранавіруснай інфекцыі».

Што датычыцца даследаванняў, то іх вынікі, у адрозненне ад даследаванняў у дачыненні да вітаміну C і цынку, часцей паказваюць на патэнцыйную пазітыўную ролю вітаміну D у зніжэнні цяжару COVID-19 у пацыентаў, якія праходзяць лячэнне ў стацыянары.

Напрыклад, установлена, што ўвядзенне высокай дозы кальцыфедыёлу значна знізіла патрэбу ў інтэнсіўнай тэрапіі ў шпіталізаваных пацыентаў з-за даказанага COVID-19. Кальцыфедыёл, відаць, можа паменшыць інтэнсіўнасць захворвання, але для атрымання канчатковага адказу патрабуюцца найбуйнейшыя выпрабаванні з належна падабранымі групамі.

Таксама даказана, што нізкі ўзровень вітаміну D у арганізме павялічвае рызыку COVID-19. Такім чынам, доказы карысці вітаміну D маюцца, а яго ўжыванне хутчэй з'яўляецца рацыянальным.

Трэба сказаць, што ў наш час урачы і даследчыкі вымушаны выбіраць метады лячэння ва ўмовах дэфіцыту часу. З аднаго боку, гэта перашкаджае ажыццяўленню працяглых добра спланаваных клінічных выпрабаванняў, а з іншага боку, мноства вучоных шукаюць адказы на адны і тыя ж пытанні. Таму інфармацыя аб шкодзе ці карысці метадаў лячэння абнаўляецца вельмі хутка, і трэба быць гатовымі да хуткай змены рэкамендацый і пратаколаў лячэння ад COVID-19.

Извещение о проведении **31 марта 2022** года повторных торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир), принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1	Квартира по адресу: г. Минск, ул. Бельского, 35-8 (2-й этаж, однокомнатная, общая площадь – 33,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 33,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-316898)	109 206,75	5 000,00
2	Квартира по адресу: г. Минск, ул. Плеханова, 56/1-223 (9-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 62,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 63,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-440229)	153 140,50	5 000,00
3	Квартира по адресу: г. Минск, ул. Неманская, 25-202 (3-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 77,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 80,7 кв. м, инвентарный номер 500/D-707998017)	213 141,45	5 000,00

Продавец имущества: ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. Карла Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов:

1. победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

2. расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей, внесшие задаток (задатки) по соответствующему предмету торгов и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического или физического лица (для физического лица – документ, удостоверяющий личность; для представителя физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя и нотариально заверенная доверенность; для представителя юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица), а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах (назначение платежа – задаток для участия 31.03.2022 в повторных аукционных торгах по предмету торгов №__).

Участнику, не ставшему победителем торгов (покупателем), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Шаг аукциона, за исключением первого шага аукциона, устанавливается организатором торгов в фиксированной сумме, составляющей **5 000,00 бел. руб.** Первый шаг аукциона устанавливается в фиксированной сумме, составляющей пять процентов от начальной цены предмета торгов.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом имущества и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 15 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **31 марта 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 16.03.2022 по 29.03.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра жилых помещений обращаться по телефонам: (017) 395-48-60, (044) 777-11-58.

Телефоны для справок: государственное предприятие «МГЦН» (017) 360-42-22, 365-48-36; ОАО «Минский домостроительный комбинат» (017) 395-48-60, (044) 777-11-58.

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – **www.mgcn.by.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Химчистка и стирка белья»

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

Повторный аукцион состоится 30 марта 2022 года в 15.00 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.

Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв. м):

ЛОТ № 1 – изолированное помещение с инв. № 700/D-152301, общей площадью 363,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-2;

• изолированное помещение с инв. № 700/D-152300, общей площадью 156,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-1;

• капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81484, общей площадью 78,0 кв. м; капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81483, общей площадью 128,0 кв. м; капитальное строение (благоустройство территории) с инв. № 700/С-106077, общей площадью 3315,4 кв. м; ворота металлические; ограждение металлическое; эстакада железобетонная, расположенные по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 159.

Начальная цена продажи – 89 100 р. 00 к. (с учетом НДС). **Начальная цена продажи снижена на 19 %.**

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

Последний день приема заявлений и внесения задатка – 29 марта 2022 года до 13.00.

Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **www.mogilev-region.gov.by**, Могилевского городского исполнительного комитета **www.mogilev.gov.by.**

ОАО «Барановичская птицефабрика» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится 6 апреля 2022 года в 10.00 по адресу: Брестская область, Барановичский район, п/о Русино здание клуба ОАО «Барановичская птицефабрика»

Сведения о предмете аукциона (лот)	**Капитальное строение с инвентарным номером 112/С-6578 (наименование: магазин; назначение: здание специализированное розничной торговли),** общей площадью 74,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская область, Ганцевичский район, г. Ганцевичи, ул. Парковая, 12, на земельном участке с кадастровым номером 121650100001000235, площадью 0,0352 га		
Начальная цена без учета НДС руб.	45 500,00	**Размер задатка, руб.**	4 550,00

Продавец и организатор аукциона: ОАО «Барановичская птицефабрика», 225350, п/о Русино, Барановичский район, Брестская область, 8 0163 44 86 22.

Задаток перечисляется с даты публикации данного извещения по 5 апреля 2022 года на расчетный счет Продавца BY73BAPB30124401000110000000 ОАО «Белагропромбанк», ул. Советская, 150, БИК BAPBBY2X, ОКПО 00745326, УНП 200177723. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты: единовременный платеж в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.

Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения

Договор купли-продажи объекта аукциона заключается не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией по адресу: 225350, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика»

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225350, Брестская область, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика» с пометкой «На аукцион» с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 по рабочим дням по 5 апреля 2022 года включительно

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, а также порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, и иная информация содержатся на сайте Продавца www.zlatko.by, а также можно узнать по телефону 8 0163 44 86 83 (юр. сектор)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «РСУ «Мясомолоко» г. Слуцк (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

• административное здание с инв. № 640/С-69176 *(составные части и принадлежности: подвал, теплоузел, склад, навес, покрытие, забор железобетонный, ворота проходной, ворота)* **общей площадью 675 кв. м;**

• производственная база с инв. № 640/С-60156 общей площадью 842,7 кв. м;

• здание охранной деятельности с инв. № 640/С-83445 общей площадью 11,3 кв. м (далее – Объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001007512 *(право постоянного пользования)* **площадью 0,8690 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Тутаринова, 8.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **404 760,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **40 476,00** бел. руб.). *Начальная цена снижена на 50 %.*

Объекты обременены договорами аренды (дополнительные сведения можно получить у организатора аукциона).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 26.11.2021, 22.02.2022.

Аукцион состоится **28.03.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.03.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (044) 545 37 36.

УНП 600154328

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638**
Продавец	**ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. УНП 101063229. Тел. + 375 29 688-04-88**

Предмет повторного аукциона
Местоположение **– Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

Лот № 1

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (номер дома)
Изолированное помещение № 1 (производственное помещение)	206,3 кв. м	600/D-91728	3А-4
Изолированное помещение № 2 (административное помещение)	221,7 кв. м	600/D-91729	3А-4а
Изолированное помещение № 3 (производственное помещение)	288,4 кв. м	600/D-91730	3А-4б
Складское помещение	205,2 кв. м	600/D-40243	3-7

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 524 960,00 бел. руб. (снижена на 10 %)
Шаг аукциона – 76 248,00 бел. руб.

Лот № 2

Административное помещение	233,6 кв. м	600/D-40239	3-5
Административное помещение	83,9 кв. м	600/D-40241	3-6

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 627 480,00,00 бел.руб. (снижена на 10 %)
Шаг аукциона – 31 374,00 бел. руб.

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

Порядок ознакомления: в рабочие дни по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение 3 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.02.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**31.03.2022 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата и время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 16.03.2022 до 17.00 29.03.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)* **по поручению открытого акционерного общества «Передвижная механизированная колонна № 69»** *(Продавец)* **проводит открытый аукцион**

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАСТЕРСКОЙ

(составные части и принадлежности: площадка, подъездная дорога), **инв. № 623/С-57971, общей площадью 1220,1 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625682506101000262** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,4730 га по адресу: Минская область, Узденский район, Озерский с/с, д. Королево, ул. Парковая, 1/1.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0510 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **296 475,65** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **29 647,56** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **18.04.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.04.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.
Тел. для осмотра: 8 (029) 393-99-70.

УНН 600000236

В **суд Бобруйского района и г. Бобруйска** поступило заявление о признании гражданки МЯЛКИНОЙ Надежды Иосифовны безвестно отсутствующей, 15 января 1942 года рождения, последнее известное место жительства: г. Бобруйск, проспект Строителей, д. 48, кв. 145. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гр. Мялкиной Надежде Иосифовне, сообщить их суду Бобруйского района и г. Бобруйска в течение двух месяцев со дня публикации.

ЗАГАДКІ ДАЎНЯГА ФОТАЗДЫМКА

Нечаканая рэліквія

У Мінск гэты фотаздымак трапіў у 1955 годзе. Яго прывёз з Ленінграда Фёдар Мікалаевіч Рунцоў для сваёй стрыечнай сястры Людмілы Канстанцінаўны Рунцовай. Пры якой нагодзе гэта адбылося — уладальнікі не помняць. Дароўнага надпісу здымак не мае, адно толькі алоўкам пазначана падзея, год і некаторыя яго «ўдзельнікі». Ён захапляў і здзіўляў гасцей дома Людмілы Канстанцінаўны і быў аб'ектам гонару яго гаспадароў, якія добра ведалі, што валодаюць рэдкай каштоўнасцю.

Прайшло больш чым паўстагоддзя, перш чым гэты рарытэт разам з іншымі дакументамі сям'і Рунцовых трапіў у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Перадала яго траюрадная пляменніца Фёдара Мікалаевіча і ўнучка Людмілы Канстанцінаўны Рунцовых Галіна Барысаўна Градасава. Багатая памяццю свайго роду і ашчадная да ўсіх рэліквій, якія захаваліся яшчэ з юнацтва яе бабулі, яна ў рэшце рэшт прыняла рашэнне аб перадачы дарагіх ёй дакументаў пад дзяржаўную апеку. Адбылося гэта ў красавіку 2006 г. З тае пары і вядзецца пошук звестак пра падзеі, якія могуць быць звязаныя з гэтым здымкам, а таксама пра лёсы тых, хто на ім адлюстраваны.

ІЛЬЯ РЭПІН, КАРНЕЙ ЧУКОЎСКІ І ІНШЫЯ

На адваротным баку здымка маецца штамп «Фотография = Прогрессъ = С.П.Б. Вас. Остр. Большой пр. 85—2, угол Весельной ул.» і напаўсцёрты надпіс простым алоўкам, магчыма, што рукой Фёдара Рунцова: «[Редакция] «Вестника знания» в гостях у И. Е. Репина. 1912. 1) Репин 2) Битнер 3) Макстысь 4) Рунцов 5) Северова Н. Б. 6) Чуковский». З гэтага надпісу зразумела, што сам уладальнік некаторых асоб са здымка не ведаў ці не помніў, альбо запісаў толькі тых, хто ўвайшоў у гісторыю мастацтва, літаратуры і навукі. Што да анатавання фотаздымка, то асобы на ім размешчаны ў наступным парадку: 1-ы шэраг (сядзяць) — невядомая, Наталля Нордман-Северава, Карней Чукоўскі, невядомы; 2-гі шэраг (стаяць) — невядомы, Ілья Рэпін, Вільгельм Бітнер, Роберт Макстысь, Фёдар Рунцоў.

Што аб'ядноўвала ўсіх гэтых людзей? Сабраліся яны выпадкова, шарагоўцы бясконцых візітаў у «Пенаты» Рэпіна, ці іх яднала нейкая агульная справа? Вельмі значнай інфармацыяй для разгадкі гэтай таямніцы з'яўляецца запіс: «Вестник знания».

ВІЛЬГЕЛЬМ БІТНЕР І ЧАСОПІС, ЯКОГА «НЕ БЫЛО НАВАТ ЗА МЯЖОЙ»

«Вестник знания» — адзін з найбольш папулярных часопісаў для самаадукацыі, які выдаваўся ў Санкт-Пецярбургу ў пачатку XX стагоддзя. Выдаваў яго Вільгельм Бітнер, які ў свой час працаваў у выдавецтве Сойкіна, супрацоўнічаў з часопісам «Природа и люди», а з 1899-га ў часопісе «Научное обозрение» вёў раздзел «Народный университет». Ідэя народных універсітэтаў была вельмі распаўсюджанай у Еўропе канца XIX — пачатку XX стст. Прыблізна ў 1889 г. Бітнер ажыццявіў паездку ў Германію, дзе наведаў пасяджэнне берлінскага таварыства «Уранія». Пасля прыезду ў Санкт-Пецярбург ён напісаў пра «Уранію»: «У ёй злучаюцца музей, астранамічная абсерваторыя, фізічны кабінет, акварыумы, віварыумы і да т. п., тэатр, чытанні лекцый з розных галін ведаў, рэдакцыя вельмі добрага навукова-папулярнага часопіса і сур'ёзная навуковая ўстанова для самастойных даследаванняў у галіне прыродазнаўства. Дык чаму ж у нашай убогай Расіі, дзе народу так неабходная адукацыя, не стварыць што-небудзь накшталт «Ураніі»?» У хуткім часе Бітнер пачаў ажыццяўляць сваю мару. Адным з прагрэсіўных яго праектаў стала выданне часопіса «Вестник знания», які выходзіў з 1903 да 1918 гг. і меў вялікую папулярнасць. Падводзячы вынікі сваёй двухгадовай работы, рэдакцыя часопіса адзначала: «Дзякуючы створанаму намі тыпу часопіса, падобнага на які не было нават за мяжой, у нас атрымалася вельмі шырокае кола чытачоў: побач з вышэйшай інтэлігенцыяй (прафесары, студэнты, урачы), мы маем падпісчыкаў сярод простых рабочых і ледзьве адукаваных, але мыслячых сялян».

ПАДЗВІЖНІЦА ІДЭІ КАРЫСНАЙ ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сярод актыўных праваднікоў многіх ідэй «Вестника знания» была выдатная жанчына і неардынарная асоба свайго часу Наталля Барысаўна Нордман-Северава.

Нордман (літ. псеўданім Северава) нарадзілася ў 1863 г. у Хельсінкі ў сям'і рускага адмірала шведскага паходжання і рускай дваранкі, атрымала выдатную хатнюю адукацыю, валодала шасцю мовамі, займалася музыкай, лепкай, маляваннем і нават фатаграфіяй. У пошуках незалежнасці і карыснай грамадскай дзейнасці ў 1884 г. яна, супраць волі сям'і, паехала ў ЗША, дзе працавала на ферме. Праз год вярнулася ў Расію і пасялілася ў сваёй сяброўкі княгіні Ценішавай, якая ў той час жыла ў Маскве. Захапілася тэатрам, іграла на адной з аматарскіх сцэн. У маскоўскім тэатры «Парадыз» Нордман пазнаёмілася з маладым купцом Аляксеевым, якога пазней будуць ведаць як заснавальніка знакамітага ММАТа пад прозвішчам Станіслаўскі, рэжысёрам Фядотавым. Менавіта яны прарочылі Нордман будучыню выдатнай камедыйнай актрысы. Атмасфера «жывапісу і музыкі» дому Ценішавай спрыяла многім захапленням Нордман (балетнымі танцамі, Італіяй, фатаграфіяй, псіхафізіялогіяй, палітычнай эканоміяй) і знаёмствам з многімі выдатнымі людзьмі. Адным з такіх лёсаносных для яе было знаёмства з тады ўжо знакамітым мастаком Ільёй Яфімавічам Рэпіным, які быў нейкі час выкладчыкам школы, заснаванай Ценішавай ужо ў Санкт-Пецярбургу.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ — ЗДРАЎНЁВА — КУОКАЛА

З 1872 г. і да 1887 г. Рэпін быў у шлюбе з Верай Шаўцовай — дачкой акадэміка архітэктуры Шаўцова. У сям'і нарадзілася чацвёра дзяцей. Але праз пятнаццаць гадоў гэты сямейны саюз распаўся. Рэпін застаўся жыць са старэйшымі дзецьмі. Жыў у Санкт-Пецярбургу, дзе з 1894 г. выкладаў у Акадэміі мастацтваў, падоўгу працаваў у сваёй сядзібе Здраўнёва пад Віцебскам, якую набыў у 1892 г. У 1899 г. пазнаёміўся з Наталляй Нордман, якая завітала да яго ў майстэрню разам са сваёй сяброўкай і прыяцелькай мастака княгіняй Ценішавай. У хуткім часе Рэпін і Наталля пабраліся шлюбам. Рэпін купіў на імя Нордман невялікую сядзібу ў Куокале на беразе Фінскага заліва, каля весніц прыбілі маленькую дошчачку з надпісам «Via Penates» і пачалі яе добраўпарадкаванне. Тады ніхто і не здагадваўся, што пакупка зроблена Рэпіным, і доўгі час лічылася, што гэта Ілья Яфімавіч пасяліўся на лецішчы Нордман. Так пачыналася заснаванне знакамітых «Пенатаў» і пераезд Рэпіна ў Куокалу назаўсёды. «Пенаты» сталі, дзякуючы іх гаспадарам, вельмі папулярнымі і ў вялікай ступені выконвалі місію народнага ўніверсітэта. Тут чыталіся лекцыі, ладзіліся выставы, а ў спецыяльна набытым недалёка ад дома памяшканні, абсталяваным пад тэатр, Нордман ставіла спектаклі па сваіх п'есах.

«ПЕНАТЫ», ТЭАТР «ПРАМЕТЭЙ» І АД'ЕЗД У ЛАКАРНА

Калі распачалася работа па пошуку матэрыялаў для гэтага артыкула, першым месцам, куды звярнулася па ўдакладненне некаторых фактаў, быў Музей-сядзіба Рэпіна «Пенаты», а дакладней — да яго навуковага кіраўніка, вядомага даследчыка жыцця і творчасці Рэпіна Алены Кірылінай. У адным з лістоў Кірыліна мне напісала: «Такога здымка я не ведаю, і ён вельмі цікавы. Здымаліся яны не ў «Пенатах», а недалёка, каля тэатра «Праметэй», які быў набыты гаспадарамі «Пенатаў» для патрэб кааператараў. У той час моднай стала кааперацыя па розных прыкметах... А ў Рэпіна была асветная кааперацыя. Бітнер, галоўны рэдактар часопіса «Вестник знания», таксама меў на ўвазе народную асвету, выдаючы навукова-папулярны часопіс. У ім, у прыватнасці, друкаваліся вялікія артыкулы па гісторыі кааператарскага руху. Да 10-годдзя часопіса яго супрацоўнікі заказалі Рэпіну партрэт Бітнера, што было выканана. Ідэі народнай адукацыі былі для Рэпіна дарагімі. Супрацоўнікі і падпісчыкі часопіса прыязджалі ў «Пенаты».

Пра тэатр «Праметэй» успаміналі многія, у тым ліку Чукоўскі: «Для пастановак п'ес сваёй жонкі І. Я. Рэпін набыў на станцыі Аліла драўляны будынак дачнага тэатра, які быў больш падобны да пуні. «Праметэем» яго назвала Наталля Барысаўна. Быў ён вядомы тым, што там выступалі малады У. У. Маякоўскі і трупа У. Э. Меерхольда. У 1920-я гады будынак гэтага тэатра І. Я. Рэпін падарыў фінам».

Пасля 1912 г., калі быў зроблены гэты фотаздымак, Наталля Барысаўна Нордман-Северава пражыла ўсяго два гады. Яна цяжка захварэла і, не захацеўшы абцяжарваць Рэпіна, паехала ў Швейцарыю, у Лакарна, дзе быў шпіталь для бедных. Напісала адтуль некалькі лістоў Чукоўскаму. Памерла ў ліпені 1914 года. Яе імя і цяпер можна сустрэць у кнігах і публікацыях па гісторыі жаночага руху, а таксама па вегетарыянстве і здаровым способе жыцця. Была вядомая як пісьменніца і драматург.

ВІЗІТ ПАСЫЛЬНАГА, АЛЬБО РАЗГУБЛЕНАЦЬ КАРНЕЯ ЧУКОЎСКАГА

Пра тое, што Вільгельм Бітнер і супрацоўнікі «Вестника знаний» былі частымі наведвальнікамі «Пенатаў», сведчаць успаміны і дзённікі Чукоўскага — блізкага суседа і сябра Рэпіна. Чукоўскі пра сваю першую сустрэчу з вялікім мастаком успамінаў: «Каля паўстагоддзя таму ў дачным пасёлку Куокала стаяў недалёка ад станцыі драўляны домік, над якім высілася недарэчная вежачка з рознакаляровымі, напаўразбітымі шыбамі. Там, у вежачцы, каля пяцідзесяці гадоў таму было маё жытло, і лесвіца туды была вельмі крутая. Па гэтай крутой лесвіцы аднойчы, перад вячэрнім змрокам, вельмі лёгка, без задышкі, узабраўся да мяне пажылы чалавек — у першую хвілін ну я прыняў яго за пасыльнага — і падае мне ліст: «З Піцера, ад Івана Іванавіча...» Я ўскрываю канверт і чытаю: «Карыстаючыся ласкай Ілы Яфімавіча Рэпіна, які прынясе Вам гэтую запіску, спяшаюся паведаміць...» далей я не чытаў. Думка, што тут, перада мной, у гэтым маленечкім пакойчыку стваральнік «Бурлакоў», «Запарожцаў», «Не чакалі», «Івана Грознага», «Хрэснага ходу», прывяла мяне ў стан крайняй разгубленасці. Я стаў усаджваць яго на свой адзіны стул, але ён сказаў, што толькі з цягніка, што яму трэба хутчэй дадому, і ўсё ж затрымаўся на хвіліну, агледзець маю мізэрную кніжную паліцу».

Было гэта ў 1907 годзе. Вядомы мастак і літаратар-пачатковец пасябравалі. Рэпін вельмі паважаў і цаніў сваёго маладога сябра, і, як успамінаў Карней Іванавіч, «пачынаючы з зімы 1908—1909 года, ён стаў усё часцей і часцей бываць у мяне (разам са сваёй жонкай Наталляй Барысаўнай) і звычайна бавіў на маёй маленькай дачы ўвесь свой нядзельны вольны час».

Чукоўскі вельмі цаніў гэтае сяброўства і як мог дапамагаў мастаку ў многіх яго справах. Быў частым удзельнікам творчых сустрэч, так званых серад. Успамінаў, што серада для Рэпіна была святочным днём. У гэты дзень ён чысціў палітру, надзяваў святочны, часцей за ўсё светла-шэры, гарнітур і выходзіў у сад чакаць часцей з Пецярбурга. Ці не ў адзін з такіх дзён завітаў да яго і Наталлі Барысаўны Бітнер з усёй рэдакцыяй «Вестника знания»?

ІГУМЕНСКІ ЮНАК НА СЛУЖБЕ «ВЕСТНИКА ЗНАНИЯ»

Не так многа звестак удалося сабраць пра двух маладых паплечнікаў Бітнера з фотаздымка: Рунцова і Макстыса.

Роберт Хрыстафаравіч Макстыс (у некаторых крыніцах Макстысь) быў у свой час вядомым літаратарам, перакладчыкам, актыўным супрацоўнікам «Вестника знания». Кола яго захапленняў было вельмі шырокім, ад філасофіі да астраноміі, а сам ён з'яўляўся правадзейным членам Рускага астранамічнага таварыства. На час стварэння гэтага фотаздымка Макстыс жыў у Рызе, але вельмі часта наведваў Пецярбург, вёў перапіску з многімі вучонымі. У адным са сваіх лістоў у Пецярбург да вучонага Марозава Макстыс паведамляе, што рыхтуе зборнік на латышскай мове пад назвай «Прырода», і што большая частка кнігі прысвячаецца астраноміі, фізіцы і хіміі. Праз кароткі час, 5 мая 1912 г., у лісце да таго ж Марозава ён паведамляе: «у канцы мая буду ў Пецярбурзе. Зайду асабіста падзякаваць Вам». Пісаў Макстыс і пра пераезд на сталае жыхарства ў Пецярбург, што, відаць, у хуткім часе і адбылося. У адзін са сваіх прыездаў ён, відавочна, разам з калегамі і завітаў у «Пенаты».

Не менш загадкавай застаецца для нас і постаць Рунцова, дзякуючы якому гэты фотаздымак і трапіў у Беларусь. Ён нарадзіўся каля 1886 года ў сялянскай сям'і на хутары каля вёскі Горкі, што за 15 кіламетраў ад Ігумена (Чэрвеня). На вялікі жаль, ніхто з яго родных не змог паведаміць пра яго дзяцінства і вучобу тут, у Беларусі. Вядома толькі, што ён зусім маладым хлопцам паехаў у Санкт-Пецярбург, відавочна, каб працягнуць вучобу ва ўніверсітэце. Невядома, пры якіх абставінах ён пазнаёміўся з Бітнерам і калі стаў супрацоўнічаць з «Вестником знания», але ўжо ў пачатку 1910-х ён згадваецца як яго паплечнік, а яшчэ як рускі літаратар, журналіст, папулярызатар навуковых ведаў. Ён быў добра знаёмы з Рэпіным і яго жонкай Нордман-Северавай. У 1914 годзе Рунцоў напісаў невялікі ўспамін «Впечатления с лекции Н. Б. Северовой», у якім з захапленнем расказаў пра яе неардынарную асобу. Рунцоў пісаў і вершы. У 1913 г., да 10-годдзя заснавання «Вестника знания», напісаў словы да яго гімна, музыку для якога стварыў вядомы кампазітар Архангельскі. Была выпушчана юбілейная ўлётка з партрэтамі Архангельскага і Рунцова і словамі гімна. Пасля рэвалюцыі Рунцоў жыў і працаваў у Ленінградзе. Памёр у 1962 годзе. Як успамінаюць яго сваякі, не забываў Беларусь, наведваў родныя мясціны.

Ганна ЗАПАРТЫКА.

Пласты гісторыі

БАРСУК-СКАРБАШУКАЛЬНІК

Галодная жывёла знайшла скарб часоў рымскай эпохі

Жыхар іспанскага рэгіёна Астурыя знайшоў скарб з манетамі часоў рымскай эпохі. Яго мог адкапаць дзікі барсук, які шукаў ежу, паведамляе The Local.

Іспанец Раберта Гарсія заўважыў рассыпаныя старажытныя манеты падчас прагулкі і паведаміў аб гэтым мясцовым гісторыкам. Знаходка была зроблена ў пячоры Ла Куэста дэ Берсія каля горада Града.

У пячору адправілі экспедыцыю навукоўцаў, якая знайшла 209 рымскіх манет, што знаходзіліся ў абарачэнні ў III—V стагоддзях нашай эры. Большая частка манет позняй рымскай эпохі паходзіць з Паўночнага і Усходняга Міжземнамор'я — з Антыёхіі, Канстанцінопаля, Салонік: яны выраблены з медзі і бронзы.

Навукоўцы лічаць, што скарб выпадкова адкапаў барсук, які шукаў ежу падчас снежнай буры. Яна паралізавала Іспанію ў студзені 2021 года. Манеты былі знойдзены ўсяго за пару метраў ад яго нары. На сённяшні дзень гэта самая вялікая скарбніца рымскіх манет, знойдзеная на поўначы Іспаніі.

Біялогія з анатоміяй

БІЯМАРКЁР СТАРЭННЯ

Прыдумалі, як па сятчатцы вызначыць працягласць жыцця чалавека

Новае даследаванне аўстралійскіх вучоных упершыню ўказала на тое, што па сятчатцы вока можна меркаваць аб працягласці жыцця чалавека ў цэлым.

Навукоўцы з Аўстралійскага цэнтра вочных даследаванняў (CERA) стварылі саманавучальную камп'ютарную праграму, здольную па сятчатцы вока не толькі вызначыць біялагічны ўзрост чалавека, але і прадказаць, якія праблемы са здароўем ён можа зведаць у будучыні і нават колькі ён пражыве.

Алгарытм дае такія дакладныя вынікі, што падчас эксперыментаў дазволіў вылічыць узрост 47 тысяч брытанцаў сярэдняга і пажылога ўзросту з хібнасцю не больш за 3,5 года, паведамляе «Бі-бі-сі».

Паколькі даследаванні былі расцягнуты па часе больш чым на дзесяцігоддзе з моманту, калі былі зроблены здымкі, паспеў памерці 1871 чалавек, і ў гэтую групу трапіла большасць людзей, чыя сятчатка выглядала старэйшай.

Хоць раней ужо праводзіліся даследаванні, якія дазволілі выказаць здагадку, што па стане клетак вочнага дна можна рабіць высновы аб пагрозлівых для чалавека сардэчна-сасудзістых захворваннях, праблемах з ныркамі і іншымі органамі, новае даследаванне ўпершыню ўказала на тое, што па сятчатцы можна меркаваць і аб працягласці жыцця чалавека ў цэлым.

Даследчыкі звязваюць гэта з тым, што тканкі сятчаткі насычаныя крывяноснымі сасудамі і нервовымі канцамі, што дае важную візуальную інфармацыю аб стане мозга і сардэчна-сасудзістай сістэмы. Па словах навукоўцаў, сятчатка такім чынам служыць акном, у якім можна ўбачыць існуючыя і будучыя неўралагічныя праблемы.

«Наша работа пацвярджае гіпотэзу аб тым, што сятчатка адыгрывае важную ролю падчас старэння арганізма і вельмі адчувальная да сукупных страт, што наносіць гэты працэс, які павышае рызыку смяротнага зыходу», — робяць выснову аўтары даследавання.

Хоць навуцы вядомыя і іншыя біямаркёры старэння, яны далёка не такія дакладныя, як вызначэнне ўзросту па сятчатцы, да таго ж вельмі дарагія, забіраюць шмат часу і з'яўляюцца інвазіўнымі.

А вось сятчатку можна адсканаваць менш чым за пяць хвілін, і калі ў ходзе далейшых даследаванняў атрымаецца зрабіць прывязку гэтай тканкавай праслойкі да астатняга арганізма, то ва ўрачоў у руках будзе новы цудоўны дыягнастычны інструмент.

Тэхналогіі будучыні

А АКУНЬ СУПРАЦЬ!

Рэчывы з яго арганізма дапамогуць змагацца з супербактэрыямі

Выкарыстанне рэчываў, якія выпрацоўваюцца арганізмам марскога акуня, можа дазволіць вярнуць у клінічную практыку антыбіётыкі, да якіх бактэрыі ўжо сфарміравалі ўстойлівасць, высветлілі расійскія навукоўцы.

У Стаўрапальскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце даследавалі актыўнасць пептыду Epi-1, які прадуцыруецца клеткамі памяранца-плямістага марскога акуня. Таксама ў даследаванні ўключылі hBD-3, які выпрацоўваецца эпітэліяльнымі клеткамі чалавека.

Даследчыкі заразілі лабараторных мышэй смяротнай дозай бактэрый і ўвялі ім пептыды ў розных камбінацыях, у тым ліку разам з антыбіётыкам з групы карбапенемаў — папулярным для барацьбы з бактэрыямі прэпаратам.

«Сам па сабе, «сола», антыбіётык не змог бы вылечыць жывёл, бо мышэй заражалі штамамі бактэрый, устойлівых да гэтага прэпарату, — растлумачыў кіраўнік даследавання Альберт Балатчыеў. — Перад намі стаяла задача аціаніць, як працуе камбінацыя «пептыд чалавека+антыбіётык» у параўнанні з hBD-3 у монатэрапіі (калі ўжываюць толькі адны лекі), антыбіётыкам у монатэрапіі і камбінацыяй двух пептыдаў — з акунёў і чалавека».

Праз пяць сутак пасля заражэння ў кантрольнай групе загінулі ўсе жывёлы, тое самае адбылося з мышамі, якія атрымлівалі толькі антыбіётык. Затое 63 працэнты грызуноў, якія атрымалі аднаразовую ін'екцыю hBD-3, выжылі. Крыху больш мышэй пазбегла смерці дзякуючы адначасоваму ўвядзенню рэчываў з арганізма чалавека і рыб, а таксама пры выкарыстанні спалучэння пептыду і антыбіётыку.

На падставе вынікаў эксперыментаў навукоўцы зрабілі выснову, што ўжыванне антымікробных пептыдаў можа зрабіць бактэрыі зноў адчувальнымі да класічных антыбіётыкаў.

Ад пачатку свету

"ПРЭЗІДЭНЦКІ" КАЛЬМАР

Навукоўцы назвалі яго ў гонар Джо Байдэна

Найстаражытнага вядомага продка галаваногіх вампіраморфаў (архаічная група, якая ў пачатку мезазою адышла ад агульнага продка) назвалі ў гонар дзеючага прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі Джо Байдэна. Вынікі даследавання апублікавалі ў амерыканскім часопісе Nature.

Дадзены малюск, знойдзены ў штаце Мантана ў 1988 годзе, з'яўляецца далёкім сваяком кальмараў і васьміногаў. Ён атрымаў імя Syllipsimopodi bideni ў гонар Байдэна, бо заяўку на даследаванне падалі амаль адразу пасля інаўгурацыі новага кіраўніка дзяржавы. Інфармацыя аб перыядзе пасялення малюска перамясціла даследаванні на 82 мільёны гадоў назад.

Здароўе на талерцы

ПЕРАПЫНКІ БЯСПЕКІ

Навукоўцамі ўстаноўлены перавагі інтэрвальнага галадання

Такі від галадання дапамагае скінуць лішнюю вагу, а таксама робіць арганізм больш устойлівым да інфекцыйных захворванняў. Пра гэта гаворыцца ў даследаванні вучоных з Інстытута біялагічных даследаванняў Солка ў Каліфорніі, апублікаваным часопісам Cell Reports. Інтэрвальнае галаданне — рэжым харчавання, пры якім перыяды прыёму ежы чаргуюцца з перыядамі ўстрымання строга па вызначаным часе.

«Асноўным вынікам многіх клінічных даследаванняў інтэрвальнага галадання з'яўляецца страта вагі, але мы выявілі, што такі від галадання карысны не толькі супраць метабалічных захворванняў, але і для павышэння інсулінарэзістэнтнасці і ўстойлівасці да інфекцыйных захворванняў», — прыводзяцца ў даследаванні словы прафесара біялогіі Сатчыдананда Панда.

Даследчыкі правялі эксперымент на мышах, каб праверыць, як інтэрвальнае галаданне адбіваецца на функцыях арганізма. Навукоўцы кармілі лабараторных жывёлін прадуктамі з высокім утрыманнем тлушчаў і цукру, але мышы маглі сілкавацца толькі дзевяць гадзін на суткі, а астатні час галадалі.

Акрамя таго, даследчыкі правялі аналізы хімічнага складу печані, узроўню глюкозы ў крыві, ацэнку агульнай мышачнай масы ў грызуноў. Так, вынікі эксперыменту паказалі, што інтэрвальнае галаданне дазваляе падтрымліваць ніжэйшы ўзровень цукру ў крыві і забяспечвае хутчэйшае вяртанне да звычайнага яго ўзроўню пасля адхілення. Навукоўцы таксама выявілі, што такое галаданне можа засцерагчы ад смерці, выкліканай сепсісам.

Сяргей СТАРЫНАЎ.
Фота з акрытых крыніц.

У вясновай сталіцы клікалі... восень?

Кожны год у сталіцы ў першыя вясновыя дні працуе Міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш для аматараў паляванне і рыбалоўства, якую з нецярпеннем чакаюць і заядлыя рыбакі, і ахвотныя пахадзіць са стрэльбай па лясах і гонях. Нязменным арганізатарам форуму з'яўляецца Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў. На сёлетняй пляцоўцы, а яна месцілася ў сталічным Палацы спорту, акрамя продажу тавараў для адпачынку, інвентару, адмысловай экіпіроўкі і самага неабходнага рыштунку для паспяховай рыбалкі і ўдалага палявання, прайшлі прэзентацыі абласных аб'яднанняў і паляўнічых гаспадарак, таксама адбылася і выстаўка паляўнічых трафеяў. Але сапраўдным упрыгажэннем кірмашу стаў восьмы адкрыты чэмпіянат вабільшчыкаў аленя. Гэтым разам у конкурсе ўдзельнічалі дваццаць тры «дудары», якія спаборнічалі персанальна і прадстаўлялі каманды абласных таварыстваў. На самаробных і фабрычных інструментах-дудках яны імітавалі галасы аленя-самца ў час гону. Хоць гон высакароднага аленя ў нашых лясах і пушчах пачынаецца толькі ў верасні, вабільшчыкі паказалі сябе ў самай лепшай — выканальніцкай — форме, быццам бы яны знаходзіліся не ў шумным гарадскім асяродку, а ў ціхім ранішнім лесе.

Як правіла, такія спецыялісты з'яўляюцца сапраўднымі знаўцамі дзікай прыроды, прафесіяналамі егерскай службы. Журы ацэньвала кожнае выступленне па шасцібальнай сістэме. Праводзіліся два туры, каб вызначыць, які «голас аленя» быў самым басавітым, моцным і натуральным. Адразу вызначыліся лідары, і ў выніку перамаглі каманды Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта, Мінскай і Гомельскай абласных арганізацый БТПР. А найлепшым вабільшчыкам краіны стаў Уладзіслаў ПАЛУЯН — вядучы інжынер гаспадаркі па ахове Нацыянальнага парка «Прыпяцкі». Зусім крыху яму саступілі ўмелыя Максім ГУРЫН — паляўніцтва-знавец Смалявіцкай раённай арганізацыі БТПР і Сяргей ЯЦУХНА — дырэктар Нараўлянскага раённага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Па традыцыі пераможцы разам паклікалі не толькі ляснога аленя, але і прыгажуню-вясну.

Анатоль КЛЯШЧУК,
фота аўтара.

ИТОГИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ. 4 СЕЗОН. ТУР 8»

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Минт филд» (далее именуемое «Организатор»), 220052, г. Минск, ул. Гурского, д. 37, пом. 5Н, комната 5н-5/6, УНП 192465627.

Наименование рекламной игры – «Счастливый случай. 4 сезон. Тур 8».

Срок начала рекламной игры – 29 декабря 2021 года, срок окончания – 19 марта 2022 года.

